КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №12 (140)
◂ 3 КРАСАВІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час



GO ХОМА

Стар. 6

**ПРАЎДА ЯК РЭЛІГІЯ**

Беларусь як незалежная дзяржава адбылася яшчэ і таму, а мо і найперш таму, што ў яе быў Васіль Быкаў

Стар. 4

**ЛАСКАВА ПРОСІМ У БІПІДЖАН**

Пра асаблівасці азербайджанскага канстытуцыйнага і палітычнага працэсу журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з азербайджанскім палітолагам Майсісам Гулаліевым

Стар. 13

**КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Купаласлэм**

**Вачыма Марыі Мартысевіч**

▸ АД РЭДАКТАРА

# ДЫСБАЛАНСЫ ДЫЯЛОГА

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Мінулы тыдзень дадаў да дыялога Захаду з Беларуссю пэўную колькасць новых слоў і падзей, аднак не змяніў прынцыпова ні яго схему, ні яго дынаміку, ні баланс яго прамежкавых вынікаў. Відавочна аднак, што з большай нагляднасцю і кантраснасцю вызначыліся пазіцыі бакоў як у кропках іх супадзення, так і разыходжання.**



Вельмі прагматычную, а разам з тым і вельмі лагодную для афіцыйнага Мінску пазіцыю агучыў міністр замежных спраў Іспаніі Мігель Марацінас падчас яго візіту ў Беларусь. Ён выступіў за скасаванне санкцый Еўрасаюза супраць кіраўніцтва Беларусі і за далучэнне нашай краіны ў бліжэйшай будучыні да Рады Еўропы. Без усялякіх дадатковых умоў і агаворак. Матывацыя гэтага, на яго погляд, вельмі простая і моцная: «Мы палову таваразвароту маем сёння з Еўрасаюзам. Палова таваразвароту — з Усходам. Вось і ўся матывацыя. Гэта пытанне жыцця нашай дзяржавы».

Пазіцыя Іспаніі дыяметральна супрацьлеглая пазіцыі Галандыі. «Калі краіны «Усходняга партнёрства» хочуць паўнапраўных і партнёрскіх дачыненняў з ЕС, — заявіў міністр Максім Ферхаген, — няхай паважаюць нашы каштоўнасці, то бок дэмакратыю і правы чалавека». І дадаў, што Нідэрланды і надалей будуць крытыкаваць Лукашэнку, нават калі той апынецца ў Празе.

Суадносіны крайніх пазіцый з выхадам на ўзгодненае рашэнне пакуль праглядаюцца з дастатковай прыблізнасцю. «За» — за месца Беларусі ў Еўропе, аднак з выразна акрэсленай заклапочанасцю палітычнай сітуацыяй у нашай краіне, — выступілі таксама кіраўнік МЗС Швецыі Карл Більт, міністр замежных спраў Эстоніі Урмас Паэт, прэм'ер-міністр Літоўскай Рэспублікі Андрус Кубілюс. «Літва, — падкрэсліў сп. Кубілюс, — ніколі не была згодна з тым, «што для прагматычных мэтаў могуць быць забытыя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі». У гэтым жа ключы гаворыцца пра сітуацыю ў нашай краіне і ў штогадовым дакладзе МЗС Вялікабрытаніі. Пэўны акцэнт на дэмакратычных каштоўнасцях, на правах чалавека дадалі да сваёй пазіцыі Германія і Італія.

Відавочнае наблізжэнне да адзінай пазіцыі прадэманстравала і міжнародная канферэнцыя ў Брусэлі (30–31 сакавіка) пад назвай «Дарожная карта для Беларусі». Яна замыкала сабой цэлую серыю дыскусій і кансультацый, якія праводзілі еўрадэпутаты наконт Беларусі, каб падрыхтаваць прапановы да спецыяльнай «беларускай» рэзалюцыі Еўрапарламента. Асноўны сэнс прапаноў бадай што з поўнай дакладнасцю прагучаў у выступе парламентара з Вялікабрытаніі Крыстафера Бізлі, які ўзначальвае ў Еўрапарламенце так званую Паўночную групу дэпутатаў, куды ўваходзяць прадстаўнікі Вялікабрытаніі і скандынаўскіх краін.

«Калі мы глядзім на нашы спецыфічныя рэкамендацыі для беларускіх уладаў, — сказаў Бізлі, — то мы хацелі б бачыць дзве рэчы: каб унутры Беларусі адбыўся дыялог паміж уладамі і апазіцыйнымі партыямі ды выконваліся прынцыпы дэмакратыі і правоў чалавека, і каб на прынцыпах свабоды мэдыяў, павагі да правоў чалавека такія дзве адзінкі, як Еўрасаюз і Беларусь, працавалі на паспяховую будучыню разам».

Яшчэ адзін пункт разыходжанняў у асяродку ЕС — запрашэнне А. Лукашэнкі на пражскі саміт 7 мая, на якім будзе прэзентавацца праграма «Усходняга партнёрства». Аднак ацэнкі некаторых заходніх аналітыкаў, нібыта дыскусія вакол беларускага кіраўніка «расколвае ЕС», выглядаюць перабольшанымі. Пакуль што парадаксальным чынам адзінства пазіцый краін ЕС выявілася ў дамоўленасці ўстрымацца ад рашэння сёння, каб прыняць яго заўтра, з улікам крокаў афіцыйнага Мінска, непасрэдна перад самітам.

Хаця, што таксама відавочна, у краін Еўрасаюза пакуль няма агульнай, з дэталёвай дакладнасцю вызначанай пазіцыі па фармату дыялога. Але было б дзіўным яе чакаць «тут і зараз» ад 27 краін-сябраў, пад чыім бы тое ні было ціскам. У гэтым і плюсы і мінусы дэмакратыі: шлях да згоды дастаткова працяглы, у дыскусіях і спрэчках. Але ж у гэтым і абарона ад паспешлівых і няўзважаных рашэнняў.

Што ж у асадку на дзень сённяшні? Відавочна, што за час, які прайшоў ад пачатку дыялога, адпаведныя структуры ЕС — як парламенцкія, так і выканаўчыя — дастаткова дэталёва вывучылі сітуацыю ў Беларусі. І па меры іх уніклення ў беларускія праблемы, агульны баланс іх поглядаў выразна змясціўся з прагматычнага да каштоўнаснага. Дакладней, да спробы іх аптымальнага спалучэння. З тым, каб не сарваць дыялог, але і не апынуцца яго беспрынцыповымі палоннымі.

Менавіта гэты матыў і быў асноўным у адмове дэлегацыі еўрапарламентароў ад візіту ў Беларусь, запланаваным на наступны тыдзень. Як патлумачыў еўрадэпутат Ян Марынус Віерсма, каб не даць падстаў «для сцвярджэння, што мы прызнаем беларускі парламент».

Дыялог будзе працягвацца. Спатыкацца і буксаваць, зноў набіраць пэўныя абароты, зноў замаруджвацца і перапыняцца. Прынамсі ў бліжэйшыя 9 месяцаў — тэрмін, на які ЕС замарозіў санкцыі. Бо альтэрнатывы дыялогу няма. ЕС яго не спыніць. Абарваць яго могуць толькі кіруючыя колы Беларусі. Але гэта зараз не ў іх інтарэсах, бо і ў іх зараз дзеля самазахавання няма іншага выбару як балансавання, манеўравання паміж двума цэнтрамі сілы — Расіі і Захаду.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МАСТЫ. УВАГА! ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ!

**Усе цыганы — злодзеі. Так лічаць супрацоўнікі аддзялення крымінальнага вышуку Мастоўскага РАУС Гродзенскай вобласці, якія груба парушаюць Канстытуцыю РБ, што забараняе праслед людзей па нацыянальнай прыкмеце.**

Імі надрукавана і вывешана ў людных месцах горада і раёна ўлётка пад назваю «Увага, ЦЫГАНЕ…» У ёй сцвярджаецца, што на тэрыторыі Беларусі павялічылася колькасць крадзяжоў і фактаў махлярства, якія здзяйсняюць асобы цыганскай нацыянальнасці. І таму «пры з'яўленні асобаў дадзенай нацыянальнасці ў нашым раёне неадкладна тэлефануйце 102 ці свайму ўчастковаму». Тэлефанавацць грамадзян міліцыя заахвочвае тым, што званкі як з хатняга, так і мабільнага тэлефонаў бясплатныя. Па кожнаму тэлефанаванню будуць прымацца неадкладныя меры.

Гэту ўлётку былы намеснік начальніка РАУС, начальнік міліцыі аховы грамадскага парадку С. пракаментаваў так: «Са свайго службовага вопыту магу сказаць, што цыгане падобных злачынстваў здзяйсняюць агулам штогод ад 3 да 10 працэнтаў. Астатняе за намі, беларусамі».

Язэп Палубятка

### БРЭСТ. 100 ЗАБАРОНЕНЫХ КНІГ

**31 сакавіка ў Брэсцкай абласной бібліятэцы адкрылася выстава «100 забароненых кніг». «Такая выстава праводзіцца ў бібліятэцы ўпершыню, гэта свайго роду гісторыя савецкай і замежнай цэнзуры, пачынаючы з 1917 года па 2000-ы», — зазначыла намеснік дырэктара па навуцы бібліятэкі Ала Мяснянкіна.**

Яна нагадала, што забарона ўводзілася або на ўсе творы пісьменніка, які прызнаваўся «ворагам народа», або на канкрэтную кнігу, калі ў ёй згадваліся «ворагі народа», а таксама ўтрымліваліся спасылкі на іх выступленні. Былі і іншыя прычыны, паводле якіх кнігі станавіліся недаступнымі для шырокага чытача.

Мяснянкіна зазначыла, што падобныя меры ў розны час прымяняліся ў асобных рэгіёнах ЗША, Англіі, Францыі, Германіі, Аргенціны, Іспаніі, Турцыі і іншых краінах.

Цяперашняя экспазіцыя складаецца са 100 кніг рускіх, савецкіх і замежных аўтараў, чые творы былі забароненыя і падлягалі канфіскацыі з фондаў бібліятэк. У іх ліку «Д'яблы» Фёдара Дастаеўскага, «Чапаеў» Дзмітрыя Фурманава, «Залатая ліпа» Іллі Дубінскага, «У запас» Андрэя Платонава, «Лаліта» Уладзіміра Набокава, «Знесеныя ветрам» Маргарэт Мітчэл, «Па кім звоніць звон» Эрнэста Хемінгуэя, «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет» Джона Рыда.

Удзельнікі прэзентацыі маглі даведацца пра прычыны і тэрміны забароны на кожную з прадстаўленых кніг.

БелаПАН

ІСК

# АЛЕГ ВОЛЧАК СУПРАЦЬ «СБ — БЕЛАРУСЬ СЕГОДНЯ»

**31 сакавіка праваабаронца Алег Волчак падаў іск аб абароне гонару і годнасці ў дачыненні да газеты «СБ — Беларусь сегодня» ў суд Савецкага раёна Мінска.**

Волчак патрабуе абвяржэння інфармацыі, прыведзенай у артыкуле пад назвай «*Много у нас диковин, каждый чудак — Бетховен*» некага Ксенафонта Суперфасфатава ў нумары «СБ» за 6 сакавіка 2009 года.

Артыкул напісаны ў форме фельетона і распавядае пра беларускіх праваабаронцаў. Апрача Волчака ў ім фігуруе праваабаронца з Салігорска Яна Палякова, якая скончыла жыццё самагубствам у ноч на 7 сакавіка.

«Па віне адказчыка было не толькі дапушчана скажэнне фактаў, гэта было зроблена ў зневажальнай для мяне форме», — лічыць праваабаронца. А. Волчак патрабуе абвяржэння апублікаваных у газеце звестак і спагнання з рэдакцыі газеты «СБ — Беларусь сегодня» грашовай кампенсацыі за маральны ўрон у 70 мільёнаў рублёў.

Пры гэтым, зазначае ісцец, у рэдакцыі яму заявілі, што Ксенафонт Суперфасфатаў у штаце газеты не працуе. Няма такога чалавека і сярод пазаштатных супрацоўнікаў газеты.



АДМЕНА

# НЕ ФАРМАТ

**Еўрапарламент адмяніў візіт у Мінск дэлегацыі дэпутатаў, запланаваны на 6–8 красавіка. Як паведаміў БелаПАН нідэрландскі еўрадэпутат, намеснік старшыні Партыі еўрапейскіх сацыялістаў Ян Марынус Віерсма, беларускія ўлады не пагадзіліся з прапанаваным фарматам візіту.**



Ян Віерсма

Еўрапарламентары планавалі правесці шэраг сустрэч з чыноўнікамі, апазіцыяй і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, а таксама неафіцыйную сустрэчу з дэпутатамі беларускага парламента. Я. Віерсма зазначыў, што афіцыйная сустрэча з беларускімі калегамі была б «занадта паспешлівай», бо парламенцкія выбары ў Беларусі ў верасні 2008 года Еўрапарламент прызнаў недэмакратычнымі.

Еўрадэпутат выказаў шкадаванне, што візіт адменены. На мінулым тыдні ён звяртаўся ў пасольства Беларусі ў Бруселі з прапановай «перагледзець рашэнне і ўважліва вывучыць праграму візіту». Паводле слоў Віерсма, Еўрасаюз гатовы запрасіць прэзідэнта Беларусі на саміт у Прагу, у той час як беларускі ўрад адмаўляе ў візіце прадстаўнікам Еўрапарламента.

Разам з тым Я. Віерсма выказаўся за працяг еўрапейска-беларускага дыялогу.

БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАСАЮЗ

# ДАРОЖНАЯ КАРТА ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Канферэнцыя «Дарожная карта для Беларусі» прайшла 31 сакавіка ў Бруселі па ініцыятыве трох фракцый Еўрапарламента. Сярод тэм заяўленых дакладаў — перамены ў Беларусі з кастрычніка 2008 года і перспектывы развіцця адносінаў ЕС з Беларуссю.**

У канферэнцыі прынялі ўдзел кіраўнік фракцыі Еўрапейскай народнай партыі Джозэф Дол, сацыял-дэмакратычнай — Марцін Шульц і ліберальнай — Грэхем Уотсан, старшыня Еўрапарламента Ганс-Герт Пэтэрынг і кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю Яцэк Пратасевіч. А таксама прадстаўнікі структур ЕС, старшыня БАЖ Жанна Літвіна, незалежны эксперт Ірына Віданава, лідэры АГП Анатоль Лябедзька і Руху «За свабоду Аляксандр Мілінкевіч, пасол Беларусі ў Бельгіі Уладзімір Сянько.

«Дарожная карта» — гэта схема паступовага развіцця адносінаў ЕС з Беларуссю. Восенню 2008 года ЕС з 12 рэкамендацый Беларусі выдзеліў пяць прыярытэтных: адсутнасць у краіне палітзняволеных; дэмакратызацыя выбарчага заканадаўства; забеспячэнне роўных умоў работы СМІ; стварэнне ўмоў для нармальнай дзейнасці палітычных партый і НДА; выключэнне з Крымінальнага кодэкса артыкулаў, якія тычацца крымінальнага праследу за грамадскую і палітычную дзейнасць.

Удзельнікі канферэнцыі «Дарожная карта для Беларусі» сталі аўтарамі ідэі развіцця дыялогу паміж Беларуссю і Еўрасаюзам і заявілі пра неабходнасць яго працягу. Асобна адзначалася неабходнасць уключэння ў дыялог апазіцыі.

Як паведамляе прэс-служба Аляксандра Мілінкевіча, у сваіх выступах прадстаўнікі беларускай дэлегацыі казалі, што калі ёсць пэўныя пазітыўныя змены ў Беларусі, то яны на дадзены момант павярхоўныя і недастатковыя. Самае галоўнае — зрабіць зараз так, каб быў спынены палітычна матываваны праслед. Людзі і іх абарона павінны быць на першым месцы. Выступоўцы казалі пра неабходнасць зменаў у крымінальнае заканадаўства, якое мае палітычныя артыкулы. Усе таксама выказваліся за неабходнасць удзелу Беларусі у праграме «Усходняга партнёрства».

Лідэр Руху «За Свабоду» актыўна выступаў за спрашчэнне для беларусаў працэсу атрымання шэнгенскіх віз і іх большую даступнасць. Паводле агучаных у дакладзе Віданавай дадзеных рэспубліканскага апытання сацыялагічнай лабараторыі «Новак» (снежань 2008), 67 працэнтаў дарослых беларусаў ніколі не былі ў краінах ЕС — нават у Польшчы ці Літве; 51 працэнт — ніколі не размаўлялі з прадстаўніком Еўразвязу. «Мы мусім зрабіць усё, каб візы былі таннейшымі і з часам бясплатнымі, каб сапраўды адкрыць Еўропу для беларусаў», — адзначыў Мілінкевіч.

Паводле БелаПАН і прэс-службы Руху «За свабоду»

МЕРКАВАННЕ

# ШАНЕЦ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**«Менавіта цяпер у прэзідэнта Беларусі ёсць сур'ёзны шанец скарэктаваць палітыку Беларусі, адысці ад самаізаляцыі да дэмакратычнага развіцця, трансфармацыі разам з іншымі краінамі «Усходняга партнёрства» — такое меркаванне выказаў старшыня нямецкай грамадскай арганізацыі «Правы чалавека ў Беларусі», экс-кіраўнік місіі АБСЕ ў Беларусі Ханс-Георг Вік у інтэрв'ю радыё «Нямецкая хваля».**



На думку палітыка, Аляксандру Лукашэнку неабходна зрабіць выбар за або супраць еўрапейскай інтэграцыі. Вік станоўча ацаніў магчымае рашэнне пра запрашэнне прэзідэнта Беларусі для ўдзелу ва ўстаноўчым саміце палітыкі «Усходняга партнёрства» 7 мая.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што апошнім часам у Беларусі адбыліся «павярхоўныя змены, не было ніякіх істотных рэформ». «Аднак цяпер Беларусь успрымаецца ў іншым міжнародным кантэксце, а менавіта: як магчымая ўдзельніца праграмы ЕС «Усходняе партнёрства». Беларусі будзе дадзена гэта магчымасць пры ўмове, што краіна пойдзе шляхам рэформ», — заявіў Вік.

Еўрапейскія палітыкі, зазначыў нямецкі эксперт, лічаць, што большасць беларусаў падтрымліваюць збліжэнне краіны з ЕС. Паводле яго слоў, у «Еўропе ёсць надзея на тое, што палітыка ўцягвання краіны ў працэс інтэграцыі можа садзейнічаць наступным пераўтварэнням у Беларусі».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НЕ ДА СМЕХУ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Мы дагуляліся з расійскімі крэдытамі. Расія адмовіла Беларусі ў крэдыце на 100 мільярдаў расійскіх рублёў у сувязі з вялікім аб'ёмам ужо існых пазыковых абавязацельстваў Беларусі перад Расійскай Федэрацыяй. Пра гэта паведамілі «РИА Новости» і іншыя расійскія СМІ са спасылкай на крыніцу ў Мінфіне РФ.**

«Адмовілі: у пазычальніка ўжо дастаткова абавязацельстваў перад Расіяй», — сказала крыніца. Яна таксама паведаміла, што Беларусь запытала крэдыт у расійскіх банкаў у суме 2 мільярда долараў пад дзяржаўныя гарантыі. «Перамовы ідуць, рашэнне пакуль не прынята», — сказаў прадстаўнік Мінфіна.

Беларускія ўлады папрасілі ў Расіі ў пачатку 2009 года крэдыт у памеры 100 мільярдаў расійскіх рублёў у абмен на пераход на разлікі ў рублях ва ўзаемным гандлі. Спачатку расійскі Мінфін адмовіўся выдаваць такую суму Мінску, аднак затым стала вядома, што гэта просьба знаходзіцца на разглядзе ў расійскіх органах улады.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі 27 лютага ў Санкт-Пецярбургу патлумачыў пазіцыю беларускага боку: «Ва ўмовах фінансавага крызісу мы б маглі на пляцоўцы Расія — Беларусь досыць эфектыўна працаваць з расійскімі рублямі. У асноўным па праплатах, якія робіцца Беларуссю па асобных групах тавараў. На працягу лютага-сакавіка мы павінны выйсці на пляцоўку адкрыцця працы беларуска-расійскіх тавараў ва ўмовах крызісу. У лютым-сакавіку рэальна запусціць 100 мільярдаў расійскіх рублёў у тавараабарот паміж нашымі дзяржавамі».

Ужо настаў красавік. Грошай няма.

За апошнія паўтара гады Расія ўжо выдзеліла Беларусі крэдыты ў суме 3 мільярда долараў ЗША: у канцы 2007 года — 1,5 мільярда долараў, і яшчэ 1,5 мільярда долараў паступілі са снежня 2008-га па сакавік 2009 года. У найбліжэйшы час Расія прадаставіць Беларусі чарговыя 500 мільёнаў долараў ЗША ў рамках стабілізацыйнага крэдыту для падтрымкі эканомікі, пасля чаго агульны аб'ём доўгу вырасце да 3,5 мільярда долараў.

З іншага боку, Расія не павінна была адмаўляць у крэдыце. Ёсць вайсковыя аб'екты Расіі ў Вілейцы і ў Баранавічах (аб'ект «Волга»). Яны забяспечваюць сувязь з касмічнымі аб'ектамі Расіі і з падводнымі лодкамі ў Атлантыцы. Да таго ж, па меркаванні экспертаў, занадта танным з'яўляецца і транзіт нафты і газа.

А Беларусь усе робіць ласку Расіі. З 1 красавіка экспартная пошліна на расійскую нафту зніжана са 115,3 да 110 долараў за тону. Як паведамілі ў канцэрне «Белнафтахім», гэта вызначана пастановай Савета міністраў Беларусі № 382 от 27 сакавіка. Таксама з 1 красавіка зацверджаны стаўкі пошліны на экспарт светлых нафтапрадуктаў (у памеры 86,4 долара за тону супраць ранейшых 90 долараў) і цёмных (46,5 долара супраць 48,5 долара).

Згодна з беларуска-расійскімі дамоўленасцямі, пошліна на нафту, што пастаўляецца ў Беларусь з Расіі, у 2009 годзе разлічваецца з прымяненнем каэфіцыенту 0,356. Такім чынам, мытная пошліна на нафту з 1 красавіка знізіцца на 2 долары і складзе 39,2 долара за тону.

І пасля гэтага Беларусі адмаўляюць у крэдыце?

Тым часам, чыноўнікі на месцах не збіраюцца раіцца з народам наконт выхаду з эканамічнага крызісу. Гомельская кааліцыя Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС) атрымала адказ на свой зварот у аблвыканкам з прапановамі па пераадоленні крызісных з'яў.

Апазіцыянеры прапаноўвалі ўзмацніць ролю мясцовага самакіравання, задзейнічаць патэнцыял грамадзянскай супольнасці, стварыць антыкрызісны штаб і стымуляваць шырокую грамадска-палітычную дыскусію па праблемах мясцовага самакіравання. Прапаноўвалася таксама перагледзець мясцовы бюджэт для скарачэння чыноўніцкіх расходаў, а зэканомленыя сродкі накіраваць на стварэнне новых працоўных месцаў і падтрымку беспрацоўных. Апрача таго, прапаноўвалася даць эканамічную свабоду прыватнаму бізнесу, каб стымуляваць стварэнне новых працоўных месцаў.

Як вынікае з адказу, прапановы кааліцыі АДС разглядаліся спецыялістамі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы аблвыканкама, галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай працы, камітэта эканомікі і інспекцыі па падатках і зборах.

У аблвыканкаме лічаць немэтазгодным узмацняць мясцовае самакіраванне, таму што мясцовыя дэпутаты валодаюць рэальнымі паўнамоцтвамі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем рэгіёну. Пры гэтым у лісце нагадваецца, што падчас апошняй выбарчай кампаніі прадстаўнікі гомельскай кааліцыі АДС, зарэгістраваныя кандыдатамі ў дэпутаты, знялі свае кандыдатуры напярэдадні выбараў.

Цікава, а калі чалавек зняўся з выбараў, ён ужо больш не спецыяліст, ён не можа ўдзельнічаць у грамадзянскім жыцці? Тым больш, што апошнія выбары былі выбарамі ў парламент, а не ў кіраўніцтва Гомельскай вобласці. А мясцовыя выбары — яшчэ наперадзе.

Не падтрымалі чыноўнікі і прапанову пра стварэнне ў рэгіёне антыкрызіснага штаба. Як зазначаецца ў лісце, пры Адміністрацыі прэзідэнта ўжо дзейнічае грамадска-кансультацыйны савет, у кампетэнцыю якога ўваходзіць у тым ліку і разгляд антыкрызісных прапаноў.

Бачна, чыноўнікі на месцах не чытаюць нават «савецкіх газет». Інакш яны б ведалі, што грамадска-кансультацыйны савет пры Адміністрацыі прэзідэнта не дзейнічае, а яго пасяджэнне перанесена з-за занятасці ягонага старшыні Уладзіміра Макея.

І яшчэ несуцяшальная навіна. 1 красавіка пачынаюць дзейнічаць новыя стаўкі адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП). Як паведамляецца на афіцыйным сайце Мінгарвыканкама, новыя стаўкі ўстаноўлены рашэннем № 219 Мінскага гарадскога савета дэпутатаў.

Згодна з дакументам, па асобных пазіцыях памеры ставак павялічаны з 5 да 15 еўра. У прыватнасці, на розначны гандаль абуткам — на 5 еўра, адзеннем з натуральнай скуры, дыванамі і дывановымі вырабамі, складанымі бытавымі электратаварамі, тэлерадыётаварамі — на 15 еўра.

Стаўкі адзінага падатку з ІП пры аказанні паслуг (выкананні работ) павялічаны па васьмі пазіцыях. У прыватнасці, на фотапаслугі — на 20 еўра, відэаздымку — на 30 еўра, дзейнасць музычных калектываў, якія абслугоўваюць урачыстасці, — на 35 еўра, стаматалогію — на 15 еўра, ветэрынарыю — на 30 еўра. Рэпетытарам стаўку падатку знізілі на 5 еўра — да 40 еўра.

**Расія не павінна была адмаўляць у крэдыце. Яе вайсковыя аб'екты ў Вілейцы і ў Баранавічах забяспечваюць сувязь з касмічнымі аб'ектамі Расіі і з падводнымі лодкамі**

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІТРАПАЛІТ ФІЛАРЭТ



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Мітрапаліт Філарэт падчас сустрэчы з кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам 27 сакавіка прапанаваў увесці рэгуляванне інтэрнэту на ўзор кітайскага досведу. Паводле кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы, «інтэрнэт — дзверы, адчыненыя ў свет, ён мае магутны ўплыў, які фармуе характар і каштоўнасці. Аднак не ўсё, што знаходзіцца на тым баку гэтых дзвярэй, бяспечна, карысна і праўдзіва. Асноўная пагроза тут складаецца ў тым, што ўсякага кшталту амаральная інфармацыя зараз стала лёгка даступнай для самым уразлівых пластоў насельніцтва — дзяцей і падлеткаў. Падрастаючае пакаленне мае несфармаваную, няўстойлівую псіхіку, часта ў падлеткаў адсутнічае пачуццё самакантролю. Таму менавіта для іх і для іх будучыні віртуальны хаос аказваецца «пагібельней за ўсё». Каб пазбегнуць вышэй названых праблем, Філарэт заклікаў рэгуляваць інтэрнэт на заканадаўчым узроўні. Найлепш на ўзор Кітаю. Пачаць трэба з «брудных» рэсурсаў. Аднак ёсць верагоднасць, што ўслед за блакаваннем сайтаў парнаграфічнага характару паступяць прапановы абмежаваць доступ і да іншых, якія няправільна, з гледзішча дзяржаўнай ідэалогіі, фармуюць «няўстойлівую псіхіку» падлеткаў. А пасля і ўвогуле інтэрнэт можна «адсячы» — ад граху падалей, і свабоды слова таксама.

### АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Адзін з найбольш вядомых праваабаронцаў Беларусі Алесь Бяляцкі ў трэці раз спрабуе зарэгістраваць праваабарончую арганізацыю «Наша Вясна». На ўстаноўчым сходзе арганізацыі Бяляцкі быў у чарговы раз абраны яе кіраўніком. Але, відаць, ён зняверыўся ў магчымасці ўвайсці ў прававое поле краіны і заявіў, што гэта будзе «трэцяя і апошняя спроба». Мінюст адмаўляў у рэгістрацыі «Вясне», якая з'яўляецца сябрам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, двойчы — у 2007 годзе і ў лютым 2009-га. «На маю думку, зараз, калі сучасныя тэхналогіі дазваляюць імгненна распаўсюджваць нейкія факты, калі падзея жыве тады, калі яна выкладзена ў інфармацыі, калі ёсць кампутары, інтэрнэт, мабільная сувязь, і калі ёсць магчымасць прадстаўляць інфармацыю ў розныя незалежныя сродкі масавай інфармацыі, не існуе праблемы кантактавання праваабаронцаў паміж сабой, з грамадскай супольнасцю, канкрэтна з людзьмі, — патлумачыў рашэнне Алесь Бяляцкі. — Кожны праваабаронца можа індывідуальна працаваць, што фактычна ў апошні час намі і рабілася. Таксама мы маглі як праваабаронцы супольна дабівацца выканання нейкіх мэтаў. У любым выпадку, праваабарончая дзейнасць у тых накірунках, у якіх мы працавалі раней, будзе працягвацца». Інтэрнэт — сябра і памочнік для праваабаронца. Праўда, калі ініцыятывы па рэгуляванню сеціва не пашырацца ў тэорыі і на практыцы.

### НАТАЛЛЯ ПЯТКЕВІЧ

Фактычна адзіная жанчына з праўладных і публічных палітыкаў выйшла замуж. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч у другі раз пабралася шлюбам. Абраннікам «жалезнай лэдзі» з Адміністрацыі стаў намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка. Інтэрнэт-газета «Салідарнасць» паведаміла, што цырымонія адбылася ў Мінскім гарадскім доме шлюбаў 27 сакавіка. Мартыненка з'яўляецца намеснікам кіраўніка Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага. Праз некалькі дзён пара з'явілася на афіцыйна-ўрачыстым мерапрыемстве — уручэнні прэміі «Тэлевяршыня». Былы муж Наталлі Пяткевіч Уладзіслаў Пяткевіч узначальвае «Нацыянальныя спартовыя латарэі».

**Падрыхтавала Вольга Хвоін**



Photo.ByMedia.Net

ПУБЛІКУЕЦЦА ЎПЕРШЫНЮ

# ПРАЎДА ЯК РЭЛІГІЯ

◂ **Заканчэнне. Пачатак у №11 (139)**

**Васіль БЫКАЎ у гутарцы з Юрасём ЗАЛОСКІМ**

**Беларусь як незалежная дзяржава адбылася яшчэ і таму, а мо і найперш таму, што ў яе быў Васіль Быкаў. Быў і ёсць. Энергія яго слова і яго жыцця па-ранейшаму працуюць на Беларусь. На тую Беларусь, пра якую ён марыў і да якой мы ўсё ж такі дойдзем, — Беларусь з народам, а не насельніцтвам, — на дэмакратычную, свабодную, заможную. Прапануем увазе нашых чытачоў фрагменты неапублікаванай раней размовы з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым, якія былі запісаныя ў чэрвені 1995 года. Невядомыя гутаркі цалкам будуць надрукаваныя ў часопісе «Дзеяслоў» і змешчаныя ў адпаведных тамах Поўнага збору твораў пісьменніка.**



***— Калі ўжо гаварыць пра беларускую літаратуру, то, напэўна, у ёй Вы маеце свае прыхільнасці. Каго б Вы маглі назваць?***

— Дасавецкі Янка Купала, безумоўна. Гэта — апостал беларушчыны, незалежна ад яго пазнейшых паводзінаў. Хоць пасля ён напісаў і фальшывыя рэчы — што ж, мы ж ведаем, як тады было жыць і пісаць, — пісаў для паратунку, гэта ж адчуваецца ў радках і між радкоў. Але найбольш важна тое, што ён напісаў раней, з чыстым сэрцам, калі меў натхненне. Тое застанецца назаўсёды. Мы бачым усе яго светапоглядныя ўстаноўкі і грамадзянскія памкненні.

Багдановіч. Якуб Колас, каторы пражыў больш і, безумоўна, зазнаў эвалюцыю.

Самае галоўнае, я лічу, — што творчасць ўсё-такі павінна быць свабоднай. Калі пясняр свабодны, то ён змагаецца і гаворыць на поўную сілу. А калі ён у нейкім палоне — найбольш у палоне ва ўлады, — то яго творчасць становіцца сумнеўнай. Улада папросту распаўсюджвае яго дэкларацыі — палоннага, — але ўсе яны фальшывыя. Нават калі ён гаворыць «праўду», то яна не можа лічыцца за праўду, бо ён робіць гэта не як свабодны чалавек.

***— У гэтых адносінах маладое пакаленне ў беларускай літаратуры непараўнальна больш свабоднае, чым старэйшае.***

— Так, новае пакаленне больш свабоднае. Найперш яно свабоднае ў сваім выбары, бо мае такія магчымасці. Іншая рэч, як гэтыя магчымасці будуць рэалізаваны. Гэта ўжо залежыць ад іх саміх, ды і не толькі ад іх.

***— Вы як пісьменнік даволі хутка набылі папулярнасць і мелі магчымасць бачыць, як ставяцца да пісьменнікаў за мяжой і ў нас. Ці не было ў Вас шкадавання, што Вы — пісьменнік вось гэтага народа?***

— Для мяне даўно ўжо з'яўляецца праблемай само існаванне «народа». Асабліва цяпер я пачынаю думаць, што пакуль мы шчыравалі «дзеля народа», кляліся імем народа — у нас яго скралі. Засталася нейкая нацыянальная эліта, а нацыянальнай, народнай асновы — не стала. Не стала народа. Я гэта гавару баючыся, як нейкае святатацтва, як у ранейшыя часы гаварылі пра д'ябла і Бога. Але сапраўды, калі мы гаворым: «народ, беларускі народ» — то гэта ўвогуле абстракцыя, гэта — па інерцыі. Калі ж канкрэтней паспрабаваць сабе ўявіць: а дзе ён, гэты народ, дзе яго часткі ці хоць бы нейкая значная частка? Раней гэта было проста: існавала сялянства, яно было моўнай, культурнай, генетычнай, этнаграфічнай і г.д. асновай нацыі. Цяпер сялянства няма. Дзе цяпер сялянства? Дажываючыя пенсіянеры-калгаснікі ў вёсках ці элітныя спецыялісты ў сельскай гаспадарцы (аграномы, заатэхнікі) — хіба яны могуць уважацца за аснову нацыі? Я вельмі ў гэтым сумняваюся. Дык вось, калі культурная эліта развівала культуру — для «беларускага народа», — ЗНІК САМ НАРОД. Горад, урбанізаванае насельніцтва гарадоў, — баюся, гэта ўжо не беларускі народ; яно з Беларуссю нічога агульнага не мае, апроч, хіба што, тэрыторыі пражывання. Менск — горад «беларускі» толькі таму, што ён знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі... А ў астатнім — чым ён адрозніваецца, скажам, ад Смаленска, Цверы, Масквы?

***— Бадай аб'явамі ў метро...***

— Вот іменна — аб'явамі ў метро. І раптам з'явіліся бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоня», якія тут жа былі скасаваны «па волі народа».

***— Яны, калі папраўдзе, ад пачатку псіхалагічна не прымаліся. Мяне даўно дзівіла гэтая спадзяванка БНФ на «народ», каторы з цягам часу, мабыць, «нацыянальна ўсвядоміцца», ачуняе і падтрымае Адраджэнне. Аднак жа заклікі і палітыка БНФ не працавала на побытавым узроўні — як зараз «не працуе» мова.***



Васіль Быкаў і Аляксандр Салжаніцын

— І таму, можа быць, з-за таго і атрымалася цяпер такая параза, што ідэя Адраджэння — ідэя, канечне, правільная, высакародная, ва ўсіх адносінах цудоўная — трапіла не на тую глебу. Вот у чым справа. Можа быць, яна трапіла зарана.

У гэткіх абставінах, асабліва ў палітычных абставінах апошняга часу, — адзінае, што, можа, застаецца для дзеячаў культуры, — гэта кансерваваць тое, што ёсць — у галіне культуры, нацыянальнай ідэалогіі. Таму што калі і надалей справа пойдзе гэтак жа, то будуць зроблены захады дзеля таго, каб матэрыяльна панішчыць тое, што напрацавана за гэты час: забяруць з бібліятэк, пахаваюць у «спецхраны» выданні Ластоўскага, нацыянал-дэмакратаў, незалежную гістарыяграфію, пэўныя творы мастацкай літаратуры. А ў дадатак будзе разгорнута шалёная кампанія па дыскрэдытацыі — спярша ідэй, затым канкрэтных твораў, а пасля — іх аўтараў. Калі жывых яшчэ можна пасадзіць, то ў нябожчыкаў будуць знаходзіць нейкі кампрамат і таксама бэсціць, для таго каб скасаваць іх прыцягальны імідж. Гэта будзе зроблена, таму што камуна-фашызм абавязкова пакарыстаецца такімі метадамі. Інакш чым жа ён будзе карыстацца? Праўда — не іх рэлігія. Іх рэлігія — бязмежная хлусня. Чым яна бязмежней, тым лепш. Для нашых кіраўнікоў гэта вельмі здатны і плённы прыём.

***— Вы ўсё ж такі дазваляеце сабе разважаць пра такія рэчы, як другое прышэсце?***

— Пра гэта я нічога не думаў, у гэтым сэнсе я цёмны чалавек.

***— Тады застаецца палітыка: пра палітыку разважаць і гаварыць больш звычна. Ужо даўно чуваць, што, мабыць, галоўная бяда Беларусі — у тым, што ў яе няма агульнанацыянальнага лідэра. Вы верыце ў такі сродак вырашэння нашых грамадскіх праблем?***

— Яшчэ кажуць — у палітыцы трэба прафесіяналы. Баюся, што не прафесіяналы тут патрэбны. У многіх выпадках трэба якраз непрафесіяналы. Трэба проста чалавек з боку. Вядомы даўні выпадак: калі Форд будаваў сваю вытворчую імперыю, узнікла нейкая тэхнічная праблема, і яго спецыялісты не змаглі яе вырашыць. Тады ён запрасіў інжынера, які ніколі не меў справы з аўтамабілямі, але лічыўся нядрэнным спецыялістам. І ён хутка вырашыў тую праблему. Чаму? Таму што яго вырашэнне было свабодным ад усялякіх стэрэатыпаў. Так можа быць і ў палітыцы. Трэба найперш чалавек, каторы валодаў бы здаровым сэнсам. Вось калі ўзяць, дапусцім, Масарыка — ён мне вельмі даспадобы. Мне здаецца, у нас мала вывучаюць вопыт міжваенных дзяржаў, Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі... Тады, пасля першай сусветнай вайны, у лідэры прыйшлі вельмі сімпатычныя людзі — і ў Чэхаславакіі, і ў Польшчы. Хай генерал, маршал — Пілсудскі, — але як жа ён адбудоўваў Польшчу ў тых умовах? Яны не былі «прафесіяналамі ад палітыкі», але, тым не менш, паспяхова будавалі свае нацыянальныя дзяржавы. Чэхі памятаюць народнасць, прастату Масарыка. Пры ім міністры ездзілі на працу на трамваі — не таму што не маглі пакарыстацца персанальным аўтамабілем, а таму што гэта было непрыстойна. І небагатыя яны былі людзі. Яны служылі найперш нацыі, таму так сябе паводзілі. А нашы каму служаць?

***— Камунізм захапіў Беларусь суцэльна...***

— Ён, камунізм, увесь час імкнуўся трымаць народ у нейкім маналітным лагеры, не зважаючы на нацыянальнасці. Было адно вялікае дзяленне на камуністаў і беспартыйных (як у Афрыцы — на белых і чорных). У той час як камуністы валодалі ўсімі правамі і магчымасцямі, беспартыйныя не валодалі і іх паловай. Ідэалагічны таталітарызм выхоўваўся ці не з дзіцячага садка — акцябраты, піянеры, камсамольцы... Гэта былі, па сутнасці, сапраўдныя дзяржаўныя секты, з іх унутранай ідэалогіяй і дысцыплінай. Тое было ў інтарэсах дзяржавы і партыйнага кіраўніцтва.

***— За апошнія дзесяць гадоў «галоснасці» столькі напісана пра рэпрэсіі, ГУЛАГ, што дзіву даешся, як грамадства — «самае чытэльнае» — не баіцца паўтору таго, што было — вынікі апошніх выбараў сведчаць пра тое. Чаму ж людзі нічога не баяцца?***

— Яны нічога не баяцца, таму што грамадства па-ранейшаму застаецца неінфармаваным. Як вядома, на пачатку перабудовы гучала шмат патрабаванняў (з боку расейскіх дэмакратаў), каб кампартыя пакаялася ў злачынствах, адмовілася ад свайго злачыннага мінулага. Гэтага не было зроблена. Усе хрушчоўскія выкрыванні сталінізму былі частковымі, бо пералічваліся толькі імёны рэпрэсаваных маршалаў і кіраўнікоў, а пра народ — маўчалі. Таму ў масавай свядомасці рэпрэсіі так і засталіся рэпрэсіямі кіраўніцтва супраць кіраўніцтва, а не ўлады супраць народа.

Колькі Алесь Адамовіч заклікаў «дадумваць да канца»! А ў нас гэта ніяк не дадумана. Канцы і пачаткі нашай бяды дзесьці ў Кастрычніцкай рэвалюцыі, а можа, і яшчэ раней. І прычына нашай галоты не ў «разбурэнні сувязей паміж прадпрыемствамі», а ў тым, што ў 1917 годзе адбылася жахлівая рэвалюцыя, і Расея, разам з нацыянальнымі ўскрайкамі, улучна з Беларуссю, пайшла не ў тым кірунку. Мы пайшлі абсалютна ў тупіковую галіну і ўперліся ўрэшце ў тупік. І цяпер як вярнуцца назад? Гістарычны час гэта выключае. Як зноў збочыць у агульнае рэчышча зямной цывілізацыі — не ведае ніхто. Вот таму гэта ўсё мы і перажываем. І павінны перажыць. У гэтым сэнсе самае жахлівае — разбурэнне найбольш агульнага, боскага прынцыпу прыватнай уласнасці. З яго ўсё пачынаецца. Калі прыватную ўласнасць панішчылі, знішчылася ўсё. Бо чалавек ад жывёлы адрозніваецца тым, што здольны нечым валодаць і распараджацца. Нават леў, сабака «мецяць» сваю тэрыторыю, свае ўладанні. Прырода толькі тады дасць нейкі плён, калі яна будзе камусьці належыць. А ў нас праца людзей і ўласнасць не толькі абяздушаны, але і незаконным чынам прысвоены, можна сказаць, антылюдзьмі, нечалавекамі. Пры сацыялізме ўласнасцю народа распараджалася Палітбюро, купка людзей. З гэтага пачаліся ўсе няшчасці. І таму, каб вярнуцца ў ранейшае становішча, уласнасць трэба раздаць канкрэтным людзям. Толькі як гэта зрабіць па справядлівасці? Ёсць жа ў матэматыцы задачы, якія не маюць рашэння. Баюся, што такая ж праблема зараз у нас з уласнасцю: яна не мае свайго справядлівага вырашэння — вот у чым нявыкрутка.

***— А Украіна тым часам будуе сваю дзяржаўнасць і нават Амерыка ёй у тым дапамагае.***

— І Беларусь жа магла б здабыць такую падтрымку, тым больш што стратэгічна Беларусь, можа быць, важней за Украіну, і насельніцтва ў нас меней, таму падтрымаць нас было б лягчэй. Аднак Беларусь робіць такі вось выбар — рукамі яе палітычнага кіраўніцтва. Шчаслівейшыя прыбалты: яны выйшлі з-пад ног Расеі, засталіся збоку, пры моры. А мы — на парозе Расеі, і таму шчасця нам тут не будзе, як не стала яго колісь Вялікаму княству Літоўскаму: усё па той жа прычыне — што апынулася «паміж». Натуральна, у тых умовах, каб уратавацца, «Літва» і адціснулася ўбок, да Балтыйскага мора, і там захавалася. А ў нас тут шчасця не будзе.

**чэрвень 1995 года**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КРЫЗІС У ЛЮСТЭРКУ ФОРУМА

Вольга ХВОІН

**Аб'ядныя дэмакратычныя сілы зладзілі антыкрызісны форум. Планавалася, што падчас гэтага мерапрыемства ва ўсёй красе беларусам будзе прадстаўлена няздольнасць ураду супрацьстаяць эканамічнаму крызісу. Пасля чаго абураныя дзяржпадманам народныя масы мусілі рынуцца на вуліцы ў пошуках справядлівасці і лепшага жыцця. Арганізатары форума называлі яго своеасаблівымі «грамадскімі слуханнямі», народнай трыбунай. Толькі адна недарэчнасць атрымалася: народных мас сярод удзельнікаў не было заўважана. Прадстаўнічасць мерапрыемства абмежавалася добра вядомымі адзін аднаму заўсёднікамі палітычных мерапрыемстваў, якія ладзіць апазіцыя.**

## З аптымізмам у вір крызісу

Паколькі сходу рабочых і сялян не атрымалася, іх меркаванне наконт бягучай эканамічнай сітуацыі агучылі сацыёлагі. І гэта была бадай што самая цікавая і пазнавальная частка форума. Даследчыкі аналізавалі адносіны людзей да эканамічнага крызісу, а таксама параўноўвалі настроі ў грамадстве ў трох сумежных краінах — Беларусі, Украіне, Расіі. Супрацоўніца сацыялагічнай лабараторыі «Новак» Надзея Яфімава расказала, што даследаванне праводзіцца з лістапада мінулага года.

На пытанне "Ці закрануў крызіс Беларусь?" у лістападзе 2008 года 9 працэнтаў беларусаў адказалі адмоўна, а ў лютым гэтага — толькі два. Аднак больш за палову рэспандэнтаў лічыць, што Беларусь выйдзе з яго з найменшымі стратамі. Ад крызісу нашы суайчыннікі чакаюць спаду вытворчасці, скарачэння працоўных месцаў, паніжэння ўзроўню жыцця. Апошняе — гэта ўстойлівае негатыўнае чаканне. Змену ўладаў прагназуюць толькі каля трох працэнтаў жыхароў Беларусі. Асабіста для сябе чакаюць скарачэнне даходаў і, як вынік, абмежаванне спажывання. Цікава, што на пачатку года працу баяліся згубіць больш апытаных, чым цяпер.

«Калі гаварыць у цэлым пра тры сумежныя краіны, то найбольш негатыўныя, трывожныя чаканні характэрныя для Украіны, — расказвае Надзея Яфімава. — У Расіі назіраецца адаптацыя да крызісу, спробы знайсці выхад. Беларусы ж пакуль у разгубленасці. На многія пытанні анкеты рэспандэнты адказвалі: «не ведаю», "цяжка сказаць». Якія краіны найбольш пацярпелі ад крызісу? Большасць украінцаў лічыць, што гэта іх радзіма. Толькі 11 працэнтаў беларусаў сказалі, што гэта «сінявокая». 31 працэнт нашых суграмадзян аптымістычна лічаць, што крызіс доўга не працягнецца і сітуацыя стабілізуецца, 44 працэнта схіляюцца да думкі, што гэта зацяжны



Фота Юрыя Дзядзінкіна

працэс. У Расіі і ва Украіне больш за палову апытаных лічаць, што крызіс будзе доўгі час.

Відаць, на «крызісны» аптымізм беларусаў уплываюць праблемы са свабодай СМІ і перакананні ўладаў, што «ў нас крызісу няма». Сорак працэнтаў апытаных заявілі, што ім не хапае інфармацыі па гэтай тэме ці яна неаб'ектыўная, а палова лічыць, што маштабы крызісу журналісты перабольшваюць.

Для беларусаў крызіс пакуль праявіўся ў дзвюх іпастасях, прынамсі яны так лічаць. 89,9 працэнта апытаных назвалі рост цэн, 40 працэнтаў — скарачэнне даходаў сям'і. Толькі 7 працэнтаў сутыкнуліся са звальненнямі, а 13 — са скарачэннем працоўнага дня і вымушаным сыходам у неаплачаны адпачынак.

## І людзі да вас пацягнуцца

Пасля сацыялагічнага раскладу з тлумачэннем прычын таго, што жыць становіцца ніяк не лепш і не весялей, выступілі былы старшыня Нацыянальнага банка Станіслаў Багданкевіч. Ён жа агучыў планы па выратаванні эканомікі краіны. Сярод асноўных чыннікаў паступовага краху беларускага цуда знаны эканаміст найперш назваў стварэнне адміністрацыйна-камандный мадэлі кіравання, моцную залежнасць ад экспарту (70 працэнтаў да ВУП), захаванне неэфектыўных працоўных месцаў, стварэнне перашкодаў для развіцця малога і сярэдняга бізнесу (доля малога бізнесу складае 8,6 працэнта да ВУП), памылкі ў манетарнай палітыцы — перакрэдытаванне, рост рублёвай грашовай масы, інфляцыя і інш. У выніку «перагрэтая» эканоміка. Пры 129 трыльёнах рублёў валавога ўнутранага прадукту ў 2008 годзе было не рэалізавана 35 працэнтаў гадавой вытворчасці на суму 46 трыльёнаў рублёў (з улікам дэбіторскай запазычанасці). Інфляцыя склала 13,3 працэнта, дэфіцыт гандлёвага балансу 4,4 мільярда долараў.

Антыкрызісную праграму ўраду Станіслаў Багданкевіч разбіў ушчэнт, спаслаўшыся на яе мазаічнасць, слабыя тэмпы дэбюракратызацыі і лібералізацыі, акцэнт на знешнія запазычанасці замест рэфармавання, адсутнасць праграм па інфляцыі, валютнаму курсу, унутрынацыянальнаму рынку. Слушнай з'яўляецца крытыка ўраду ў памкненнях захаваць максімум працоўных месцаў на стратных прадпрыемствах — яны і ў лепшыя часы трымаліся на плыву за кошт датацый, дык што ўжо гаварыць пра іх канкурэнтаздольнасць і мэтазгоднасць існавання цяпер. Натуральна, праблемы назапасіліся і ў падатковай, сацыяльнай, фінансава-крэдытнай сферах.

У якасці альтэрнатывы былі прапанаваны «першачарговыя антыкрызісныя крокі». Найперш прапануецца звярнуцца да нацыі з прызнаннем памылак (толькі хто ж у нас захоча публічна сказаць: «Прабачце, але я дурань»?), затым пачаць пераводзіць эканоміку на рынкавыя рэйкі, перагледзець манетарную палітыку, адпусціць падаткі, перагледзець сацыяльныя праграмы, правесці скарачэнні чыноўніцкага апарату, дый наогул мінімізаваць бюракратычны складнік. Дарэчы, эканаміст Аляксандр Чубрык акцэнтаваў увагу менавіта на сацыяльных праграмах падтрымкі беспрацоўных, армія якіх з кожных днём можа павялічыцца. «Давайце грошы людзям, а не абстрактным юрыдычным асобам, якія ні за што не нясуць адказнасці», — заклікае эксперт.

Натуральна, прапановы шаноўных эканамістаў слушныя, і ўраду варта было б прыслухацца. Але нават калі б іх выступы гучалі для насамрэч шырокай, прадстаўнічай і не такой дасведчанай аўдыторыі, то ці многа б зразумелі слухачы? Можа, нават лепш, што да падобных форумаў пакуль не маюць доступу тыя самыя шырокія народныя масы.

ВІЗІТ

# НЕМЦЫ ЦІКАВІЦЦА БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦЮ

Марыя Крук

**На фоне палітычнага дыялогу з Захадам і эканамічнага крызісу еўрапейскія бізнесоўцы спрабуюць завязаць новыя і палепшыць старыя ўзаемадачыненні з дзелавымі коламі Беларусі. Наўпрост гэта не звязваецца з палітычнай адлігай, але ўскосныя рэплікі сведчаць пра адваротнае.**

Мінск наведала дэлегацыя нямецкіх прадпрымальнікаў з Федэральнай зямлі Саксонія пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера, міністра Саксонскага дзяржаўнага міністэрства эканомікі і працы Томаса Юрка. У Беларусі прадстаўнікі дэлегацыі мелі сустрэчы не толькі з кіраўнікамі прадпрыемстваў, але і з віцэ-прэм'ерам Уладзімірам Сямашкам, намеснікам міністра знешнепалітычнага ведамства.



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Міністр Саксонскага дзяржаўнага міністэрства эканомікі і працы Томас Юрк адказвае на пытанні журналістаў

Найперш бізнесоўцаў Саксоніі цікавіць айчынная аўтамабільная прамысловасць, вытворчасць камплектуючых для аўто, машынабудаванне і вытворчасць абсталявання. Узамен яны гатовыя прапанаваць інвестыцыі, тэхналогіі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і энергазберажэння. Разглядаюцца варыянты заключэння партнёрскага пагаднення для працы банкаў-партнёраў.

Адразу па прылёце ў Беларусь госці накіраваліся ў Жодзіна, дзе наведалі БелАЗ. Таксама ў праграме значыліся сустрэчы з кіраўнікамі Мінскага трактарнага і аўтамабільнага заводаў. Кіраўнік дэлегацыі Томас Юрк пад уражаннем ад наведвання флагманаў беларускай прамысловасці нават падзяліўся сваімі падлеткавымі ўражаннямі ад трактара «Беларусь», які быў «сімвалам гэдээраўскай сельскай гаспадаркі».

Томас Юрк адзначыў, што цяпер закладваецца падмурак для пасляктызіснага жыцця. «Ніхто не будзе рабіць выгляд, што крызіс да нас не дайшоў, — адзначыў віцэ-прэм'ер Германіі. — Цяпер час паслаць правільны сігнал. Нам варта задумацца, як захаваць пазіцыі на рынку, падумаць пра інавацыйнасць». Разам з тым ён падкрэсліў, што Германія зацікаўлена ў інвестыцыях з Беларусі: «Працэс не павінен прадстаўляць сабой вуліцу з аднабаковым рухам. Любы ўрад мусіць быць зацікаўлены ў падтрымцы сваёй эканомікі. Мы гэта робім у Саксоніі, вы — у Беларусі. Мы закранаем пытанні палітыкі стымулявання інвестыцый, абмяркоўваем магчымыя формы падтрымкі. Нашая мэта — павялічыць гандлёвы абарот». Чыноўнік не назваў канкрэтных пагадненняў, якія будуць падпісаныя па выніках візіту, спаслаўшыся на тое, што «для многіх з нас гэты візіт — прэм'ера, і чакаць падпісаных кантрактаў цяжка». Плануецца, што ў чэрвені ў межах выставы «Белагра» Беларусь наведае вялікая дэлегацыя прадстаўнікоў дзелавых колаў Саксоніі.

Адказваючы на пытанні журналістаў спадар Юрк сказаў, што Еўрасаюз адзначае працэсы дэмакратызацыі ў Беларусі. У якасці прыкладу ён прывёў урэгуляванне канфлікту, звязанага з адпачынкам за мяжой дзяцей з чарнобыльскіх рэгіёнаў. «Радуе, што дасягнуты дамоўленасці і вырашаны праблемы», — зазначыў чыноўнік. Што тычыцца эканамічнага супрацоўніцтва, то віцэ-прэм'ер Германіі назваў бізнесоўцаў больш дальнабачнымі за палітыкаў, спаслаўшыся на той факт, што яны першыя выступілі з ініцыятывай візіту, а яго папрасілі ўзначаліць дэлегацыю, каб «выйсці на новы ўзровень».

У межах візіту быў зладжаны кааперацыйны форум, на якім былі прадстаўленыя магчымасці і прапановы бакоў. Намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур падрабязна расказаў пра выгоды і бюракратычныя паслабленні, прывілеі для бізнесоўцаў, якія адкрываюць справу ў невялікіх гарадах. Пасля аптымістычнага дакладу пра сёлетні прырост ВУП і ўсё яшчэ «кіруемую» эканоміку, вольную ад сур'ёзных алігархічных і карупцыйных тэндэнцый (шэраг скандальных карупцыйных спраў, у якіх фігуруюць чыноўнікі высокага рангу, відаць, таму пацвярджэнне), Андрэй Тур усё ж прызнаў, што фінансавы крызіс у Беларусі ёсць, і ён прымушае «прымаць аператыўныя рашэнні».

▸ НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# GO ХОМА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Перад выпускам дырэктар яе сярэдняй школы ў Баранавічах прапанаваў адзінаццацікласнікам напісаць на паперцы, кім яны бачаць сябе праз пяць год, і здаць яму паперку ў заклееным канверце. Таццяна Хома выдатна памятае, што яна напісала на сваёй: «Праз пяць год я буду прадстаўляць Беларусь на міжнароднай арэне ў эканамічнай сферы». Праз пяць год, калі тэарэтычна надышоў час расклейваць канверты і суадносіць іх змесціва з рэчаіснасцю, Таню з гучным скандалам выключалі з факультэта міжнародных эканамічных адносін БДЭУ. За тое, што надта імкліва наблізілася да пастаўленай мэты. Так, уласна кажучы, мы з ёй і пазнаёміліся.**



Існуе некалькі механізмаў таго, як людзі робяцца знакамітымі. Самы элементарны з іх такі: людзі нешта зрабілі. Напісалі кнігу, выпусцілі альбом, зняліся ў кіно, выйшлі ў фінал спартовага спаборніцтва, нарадзілі 10 дзяцей, перамаглі на выбарах. У Беларусі ж больш за дзесяцігоддзе дзейнічае іншы, больш складаны механізм раскруткі тых ці іншых асобаў. Людзі робяцца знакамітымі, калі нешта зрабілі з імі. Пад знакамітасцю я маю на ўвазе не вядомасць ці рэнаме ў той ці іншай сферы жыцця нашага атыповага, як пнеўманія, грамадства, а наўпрост шырокую бульварную славу з трапляннем на старонкі айчынных адпаведнікаў жоўтай прэсы.

Калі хронікі затрымання і судовых працэсаў фактычна тоесныя свецкай хроніцы — у гэтым ёсць нешта сацыяльна нездаровае. І ў гэтым сэнсе я б жадала не знаёміцца з Таняй Хомай. Прынамсі, не знаёміцца на тым адрэзку яе жыцця, калі мы пазнаёміліся. Тое, што беларуская студэнтка ўвайшла ў раду міжнароднай студэнцкай арганізацыі, — падзея, канешне, знакавая. Прыемная і прэстыжная — але не нагэтулькі, каб стаць блізкай асабіста мне, чалавеку, далёкаму ад эканомікі і еўрапейскай моладзевай палітыкі. Аднак тое, што пазакласную актывістку і выдатніцу вучобы груба выкінулі з беларускага ўніверсітэта за атрыманае ёй міжнароднае прызнанне, стала і маёй праблемай таксама.

## ХОМА БРУТ

Нагадаю для тых, хто далучыўся да нас пасля рэкламнай паўзы. У лістападзе 2005 года Таццяна Хома была абраная ў раду *ESIB**. Выправіўшыся ў Парыж на ўрачыстасці з гэтай нагоды, дзяўчына прапусціла тры дні заняткаў і па вяртанні была адлічаная «за самавольны выезд за мяжу». Грамадскі розгалас і спробы Таццяны аднавіцца ва ўніверсітэце праз суд не далі плёну. Галоўным апанентам ахвяры беладуксістэмы выступаў рэктар БДЭУ Уладзімір Шымаў — незалежная прэса разглядала гэты канфлікт як супрацьстаянне прафесара і студэнткі.

Пасля таго, як стала ясна, што кіраўніцтва наргасу не згодна на кампраміс, адлічэнка атрымала запрашэнні працягнуць навучанне ад некалькіх універсітэтаў Еўропы. На сённяшні дзень яна студэнтка спецыяльнасці «бізнес-адміністраванне» Венскага універсітэта. Апошняя на сёння сустрэча рэктара і выгнанніцы адбылася ў сакавіку 2008-га ў Вене, калі аўстрыйскія моладзевыя актывісты, пратэстуючы супраць удзелу спадара Шымава ў канферэнцыі «Беларусь у Еўропе: эканамічнае супрацоўніцтва і палітычны дыялог», змусілі яго тлумачыць прычыны свайго ўчынку. Пакуль што працягу гэтага сумнага рэаліці-шоу не назіраецца.

У сваіх тлумачэннях рэктар Шымаў карэктны, як атамны гадзіннік. Было ўсё так: Таццяна Хома парушыла ўнутранае заканадаўства РБ, датычнае вышэйшай адукацыі, паводле якога студэнту ў час навучання забаронена пакідаць межы краіны без дазволу кіраўніцтва ВНУ. Таццяна ж у дадатак паставіла сваё жыццё пад пагрозу, бо выправілася ў сталіцу Францыі ў разгар вулічных хваляванняў. За што і выгналі.

Гэтае стройнае тлумачэнне нагадала мне іншае, вельмі балючае для мяне абгрунтаванне. Зім у чытачоў часопіса, дзе я працавала да таго ж лістапада 2005 года, канфіскоўвалі наклад свежага нумару: «Фарбы атручаныя», — цынічна казалі людзі ў цывільным збянтэжаным маладзёнам, вырываючы ў іх з рук нятанную глянцавую паліграфію. Выходзіць, і тут мела месца дбанне пра бяспеку асобных грамадзян. Але ўсе мы выдатна ведаем, як мажуць рук фарбай газеты кшталту «Анекдотаў і крассвордаў» ды «15 сутак (сотак?)», якімі заваленыя газетныя шапікі рэспублікі, і як фрывольна пачуваецца наша шматтысячная студэнцкая грамада ў перасоўваннях па краіне і па-за яе межы ў самы што ні ёсць працэс навучання і без усялякіх санкцый. Дый надзіва збегліся даты такіх разнапланавых з'яваў. Ні для каго тады не было сакрэтам, што ліквідацыя майго часопісу і выключэнне студэнцкай актывісткі — справа аднаго шэрагу.

У канцы 2005-га ўлады зачышчалі ў краіне ўсё, што варушыцца не ўздоўж, а ўпоперак прэзідэнцкай вертыкалі. Выпадкова ці не, выключэнне Таццяны Хомы з БДЭУ выглядала як класічнае сярэднявечнае аўтадафэ. Папярэджанне: і з вамі такое будзе. Гэта, зрэшты, не ўтрымала ў сакавіку–2006 ад выхаду студэнцтва на Плошчу, але здорава пералякала ладную яго частку — трэба было знаходзіцца ў Беларусі ў той час і адчуваць тое, што адчувалі мы, каб ведаць, наколькі баяліся людзі.

І таму Таня Хома вокамгненна ператварылася для сацыяльна актыўнага студэнта ў ікону тых дзён. Яна не забаялася. Гэта, відаць, была самая маладая выступоўца на прыступках ДК Прафсаюзаў падчас паслявыбарчага мітынгу 19 сакавіка 2006 года. Для многіх равеснікаў яна тады была гогалеўскі Хома Брут — бурсак, які адважыўся тройчы ўвайсці ў царкву, каб сустрэцца з жудасным Віем. Для роднага універсітэта — проста Брут. Здрайца, што навёў цень на альма-матэр. Як сцвярджала Таня ў інтэрв'ю, на кілім у рэктарат яе выклікалі толькі аднойчы — для тлумачэнняў, адкуль і чаму ў адрас БДЭУ паступае столькі скаргаў і пратэстаў.

## ХОМА SAPIENS

Мы пазнаёміліся з ёй у сакавіку 2008-га ў холе Венскай оперы — яна адмыслова зайшла туды, каб пазнаёміцца. У рэальным стасаванні толькі пацвердзілася дамінуючая рыса яе характару: Таня Хома правільная. У пазітыўным і негатыўным значэнні гэтага слова. Пазітыўная правільнасць маёй гераіні ў яе надзвычайнай мэтанакіраванасці і волі да перамогі. Негатыўная — рэктару Шымаву ніколі не будзе даравання.

Справа Таццяны Хомы стала адпраўным пунктам рэпрэсій супраць сацыяльна і палітычна актыўных студэнтаў беларускіх ВНУ. Іх пік прыйшоўся на 2006 год, калі напладзілася «каліноўцаў», але цягнуцца яны і дагэтуль: адна з грамадскіх кампаній, якую падтрымлівае венская студэнтка Хома, тычыцца выключэння з ГДУ імя Ф. Скарыны Змітра Жалезнічэнкі. Цяжка сказаць, наступствы гэта паслявыбарчых хваляванняў ці вынік увядзення ва ўсіх беларускіх ВНУ курса дзяржаўнай ідэалогіі, але 2006-ы стаў годам, калі аблічча айчыннай вышэйшай адукацыі змянілася амаль да непазнавальнасці. І найперш змены зазнаў дух беларускага студэнцтва, якое рэктараты чым далей тым болей бачаць кіраванай масай без права на ўласнае меркаванне.

На Захадзе цікавасць студэнтаў да палітыкі — несумнеўны плюс у характарыстыцы. У нас — рашучы мінус. Сацыяльная актыўнасць ухваляецца толькі ў адным выглядзе — калі ты сябар адзінай правільнай моладзевай арганізацыі. Паранейшаму імкненне студэнтаў пастажыравацца за мяжой усприймаецца адміністрацыяй ВНУ не як карысны абмен досведам, а амаль як здрада радзіме — нягледзячы на тое, што нашы і іх студэнты ды аспіранты памалу-пацюху ездзяць туды-сюды дзякуючы асабістым кантактам ліберальнай часткі прафесуры. Беларускія дыпломы і сертыфікаты лічацца несапраўднымі на Захадзе — і наадварот.

Не дзіва, што імкліва падае прэстыж беларускай вышэйшай адукацыі, і мыслячыя абітурыенты ўсё часцей падаюць дакументы ва ўніверсітэты Польшчы, Чэхіі, Літвы, Расіі ды Украіны. Уцечка мазгоў цяпер пачынаецца адразу са школьнай лавы. І гэта пры тым, што яшчэ нейкія 10 год таму стаць студэнтам БДУ, БДЭУ ці МДЛУ было сапраўды прэстыжна. У 2001-м Таня Хома марыла пра вучобу на факультэце міжнародных эканамічных стасункаў БДЭУ, паступіла на бясплатнай аснове толькі з другой спробы і менавіта таму адчайна чаплялася за права вучыцца там, калі яе выключылі.

Па яе словах, у Аўстрыі яна ператварылася ў незаўважаную, шараговую студэнтку. Налягла на нямецкую мову. Сталася кімсьці накшталт эксперта *ESIB* па правах студэнтаў у Беларусі, супрацоўнічае з парталам *generation.by* як інтэрнэт-журналістка, шмат вандруе, але ў цэлым яе пазакласная актыўнасць знізілася ў разы.

Калі мы пазнаёміліся, я заўважыла, што самы правільны горад Еўропы — Вена, надзвычай адпавядае ёй. Яна распланавала сваё жыццё, як імператар Франц Ёзэф вуліцы сваёй сталіцы, толькі ягоны Дунай не выходзіў з берагоў, а ейны — выйшаў. На чацвёртым курсе беларускага універсітэту яна планавала перавярнуць зямлю і нават намацала кропку апоры. Пасля чацвёртага семестру ў Венскім універсітэце яна плануе атрымаць дыплом па спецыяльнасці «бізнес-адміністраванне» і падмацаваць яго практычным досведам працы ў замежнай карпарацыі. Яна спадзяецца, што гэты досвед спатрэбіцца ёй, калі раптам замежныя дыпломы пачнуць прызнаваць у Беларусі.

## ПЕРАВЕСЦІ Ў ХОМЫ

Яе прозвішча магло б стаць назвай для адзінкі вымярэння моладзевай сацыяльнай актыўнасці ў сучасным беларускім грамадазнаўстве. 1 ньютан, 1 ампер, 1 кюры, 1 хома. Буйной адзінкі — такой, як тона. Цяпер, у часы, калі трыццацігадовыя пакідаюць акадэмічную кар'еру не праз нізкія выкладчыцкія заробкі і не праз кандовасць айчыннай сістэмы адукацыі, а найперш праз пустыя, абыякавыя да навукі і творчасці вочы дваццацігадовых, што сядзяць перад імі, — так і хочацца скамандаваць: Янкі, go Хома. Час рабіцца актыўнымі. Але хто ж нас паслухае?

* Саюз нацыянальных студэнцкіх аб'яднанняў Еўропы ESIB цяпер — Еўрапейскі звяз студэнтаў (European Stunents Union) — найбуйнейшая еўрапейская студэнцкая арганізацыя, якая займаецца абаронай правоў і інтарэсаў студэнтаў у Еўропе.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 6 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 15.25** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я хачу стаць акторкай».
**11.05** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Самотная жанчына з дзіцем» (Расія).
**14.20** «Будні чэмпіёнаў».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 00.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.55** Баявік «Па-за дасяжнасцю» (ЗША-Польшча).
**00.40** Дзень спорту.
**01.35** Хакей для ўсіх.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**10.40** Мультфільм. «Чабурашка».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** Забаўляльнае шоў «Рэкламная паўза».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Песні маёй краіны».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**19.05** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Мушкецёры Кацярыны». Шматсерыйны фільм. Расія 2007 год.
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.50** Нашы навіны.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Зваротны адлік». «Армія Краёва. Невядомая вайна».
**23.40** «Геніі і злыдні».
**00.10** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** Фільм «Вы не пакінеце мяне». Расія.
**15.45** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Чатыры імені». Расія, 2005г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Гучная справа».

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.40** Усё аб бяспецы.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Прыгодніцкі фільм «Хэлоўінтаун».
**12.15** Слова пісьменніка.
**12.45** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі» (Расія).
**13.40** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**14.05** Бухта капітанаў.
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Таемны госць.
**15.30** Экспедыцыя.
**16.00** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.50** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Прэм'ера! Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія). 1-я серыя.
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Венгрыя-Беларусь.
**23.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**00.10** Хакей. Формула гульні.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.30** «Гарадок».
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.30** Фільм «Куды знік Фаменка?». 1981 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Бомба для Хрушчова». «Справа Кальцова» Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бомж», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Паўсухі закон. Сутычка са Змеем». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.40** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.35** «Сумленны панядзелак».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.25** Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Турма асобага прызначэння».
**01.05** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспорт па выхадных.
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Партугаліі». Дзень 3-і.
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Іспаніі. Заезд 2-і.
**11.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 59 кг.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Шатландыя - Германія.
**14.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Фінал.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 59 кг.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 48 кг. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы.Журнал.
**19.45** Футбол. Еўрагалы.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 62 кг. Прамая трансляцыя.
**22.05** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Вось дык так!!!
**00.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 62 кг.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Серыял «Ранча».
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Багі».
**19.10** Дак. фільм «Незалежныя». Польшча, 2006 г.
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода».
**20.40** «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Хто ёсць кім?: Адвакат капіталізму.
**21.35** Мастацкі фільм «Угару, уніз». Чэхія, 2004 г.
**23.25** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**00.10** Аб'ектыў.

## 7 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Дабравешчання Найсвяцейшай Багародзіцы.
**09.15** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.50, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Серыял «Два лёсы» (Расія).
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\4 фіналу. Манчэстэр Юнайтэд - Порту. Прамая трансляцыя.
**23.45** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\4 фіналу. Вільярэал -- Арсенал.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Чакай мяне».
**10.05** «Мушкецёры Кацярыны». Шматсерыйны фільм. Расія 2007 год.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Мушкецёры Кацярыны». Шматсерыйны фільм. Расія 2007 год.
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.50** Нашы навіны.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Выжыць насуперак».
**00.10** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Чатыры імені». Расія, 2005г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Маладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Майстар і Маргарыта». Серыял.
**21.40** «Аўтапанарама».
**22.00** «Вайна. Вядомая і невядомая» 65-годдзю Вызвалення Беларусі прысвячаецца.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.00** «Надзвычайныя гісторыі».

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія). 1-я серыя.
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**11.55** Хакей. Формула гульні.
**12.30** Кінааповесць «Юркавы світанні» (СССР). 1-я серыя.
**13.45** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі» (Расія).
**14.40** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Бітва экстрасэнсаў.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.05** Жаночая ліга.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія). 2-я серыя.
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Беларусь-Польшча.
**23.20** Спорт-кадр.
**23.45** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.20** Фільм «За Вятлугай-ракой». 1986 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Андрэй Тупалеў». «Бітва за звышгук. Праўда аб Ту-144». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Вандраванні натураліста».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бомж», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Прэм'ера. «Рэктар Садоўнічы. Партрэт на фоне Універсітэта». Дак. фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Праграма Максімум».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.55** «Жаночы погляд».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Вір».
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Угро-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.35** «Вочная стаўка».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Турма асобага прызначэння».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 62 кг.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Канада - Германія.
**14.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ.
**15.45** Футбол. Еўрагалы.
**16.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 53 кг. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 62 кг.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 69 кг. Прамая трансляцыя.
**22.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Германія - Фінляндыя. Прамая трансляцыя.
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Партугаліі». Агляд.
**01.00** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км (Каталонія, Іспанія).
**01.30** Ралі. Ралійная серыя IRC у Кеніі. Агляд.
**02.00** Матаспорт па выхадных.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**18.55** Дак. фільм «Мы вольныя людзі». Польшча, 2008 г.
**19.45** Дак. фільм «Сталін. Смерць дыктатара». Германія, 2003 г.
**20.40** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Дак. фільм «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Фотааматар». Польшча, 1998 г.
**22.20** Еўропа сёння.
**22.45** Дак. фільм «Рок назаўжды». 2008 г.
**23.15** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**00.00** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 8 КРАСАВІКА, СЕРАДА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 19.25, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Меладраматычны серыял «Два лёсы» (Расія). Заключная серыя.
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі». Закл. серыя.
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\4 фіналу. Барселона - Баварыя. Прамая трансляцыя.
**23.45** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\4 фіналу. Ліверпуль - Чэлсі.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Мушкецёры Кацярыны». Шматсерыйны фільм. Расія 2007 год.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Мушкецёры Кацярыны». Шматсер. фільм Закл. серыя. Расія 2007 г.
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.50** Нашы навіны.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Клара Румянава. Апошнія 24 гадзіны».
**00.10** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Майстар і Маргарыта». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Рэальны спорт».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Top Gear. Руская версія».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.50** «Вайна. Вядомая і невядомая» 65-годдзю Вызвалення Беларусі прысвячаецца...
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Майстар і Маргарыта». Серыял.
**21.40** «Дабро пажалаваць».
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».

---

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія). 2-я серыя.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.40** Свая музыка.
**11.10** Пасоўванне+.
**11.40** Спорт-кадр.
**12.10** Кінааповесць «Юркавы світанні» (СССР). 2-я серыя.
**13.15** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі» (Расія).
**14.10** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**22.20** «Іншыя». «Засада».
**22.50** Хакей. НХЛ. Матч тыдня.

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.20** Фільм «Лімузін колеру белай ночы». 1981 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Хто Вы, містэр Борман?». «Адвакат д'ябла. Генрых Гімлер». Дак. фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Спецыяльны карэспандэнт».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Ад першай асобы». Уладзімір Мінін. Дакументальны фільм.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Вочная стаўка».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Асоба небяспечны!».
**10.50** «Галоўная дарога».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Вір».
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.05** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Угро-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**21.35** «І зноў добры дзень!».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Прэм'ера. Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Турма асобага прызначэння».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Партугаліі». Агляд.
**10.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 69 кг.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Нарвегія - Канада.
**14.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў ЗША. Паказальныя выступы.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Жанчыны. 53 кг.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 63 кг. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 69 кг.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 77 кг. Прамая трансляцыя.
**22.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Канада - ЗША. Прамая трансляцыя.
**00.00** Абранае па серадах.
**00.10** Навіны коннага спорту.
**00.15** Гольф-клуб.
**00.20** Ветразны спорт. Рэгата Volvo Ocean.
**00.50** Яхт-клуб.
**00.55** Абранае па серадах.
**01.00** «Спартовы курорт». Тэлечасопіс.
**01.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 77 кг.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**18.55** Дак. фільм «У пошуку ідышу». Беларусь, 2008 г.
**20.30** Праект «Будучыня».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** YoLife!
**21.35** Госць «Белсату».
**21.55** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Багі».
**22.00** Форум.
**22.45** Дэтэктыўны серыял «Мент».
**23.30** Дак. фільм «Я бачыла «Рассвет». Польшча, 2000 г.
**00.00** Аб'ектыў.

## 9 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.55** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна). Заключная серыя.
**11.40** Відэафільм АТН «Пастаўскія фарбы» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Уласнай персонай.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Капкан» (Расія). 1-я серыя.
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Прэм'ера. Рамантычная меладрама «Оля+Коля» (Расія). 1-я серыя.
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.05** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.55** Драма «Мне не балюча» (Расія).
**00.55** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Прэм'ера. «Мушкецёры Кацярыны». Шматсер. фільм. Заключная серыя. Расія.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «З днём нараджэння, каралева!».
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Злачынствы стагоддзя».
**23.45** «Геніі і злыдні».
**00.15** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажалаваць».
**08.50** «Майстар і Маргарыта». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Далёкія сваякі».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Прыватныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Майстар і Маргарыта». Серыял.
**21.40** «Аўтапанарама».
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.00** «Сакрэтныя гісторыі».

---

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Невытлумачальна, але факт.
**11.50** Медычныя таямніцы.
**12.15** Кінааповесць «Юркавы світанні» (СССР). 3-я серыя.
**13.20** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі» (Расія).
**15.05** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**15.55** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.55** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Беларусь-Украіна. Прамая трансляцыя.
**21.20** Калыханка.
**21.40** Футбол. Кубак УЕФА. ПСЖ-»Дынама» (Кіеў). Прамая трансляцыя.
**23.40** Экспедыцыя.
**23.45** Час футболу.
**00.10** Футбол. Кубак УЕФА. Агляд дня.
**00.55** «Проста праграма».

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.15** Фільм «Нікуды не вартая». 1980 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Таямніца зніклага абраза». Дакументальны фільм.
**15.50** «Стварыўшая цуд». Дак. фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Коткіна хата. Юры Куклачоў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.25** Прэм'ера. «Кухары і кухцікі».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Вір».
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Угро-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**21.35** «Да бар'ера!». Ток-шоў Уладзіміра Салаўёва.
**22.45** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Прэм'ера. Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Турма асобага прызначэння».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Партугаліі». Агляд.
**11.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 77 кг.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Германія - Данія.
**14.00** Футбол. Кубак УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ.
**14.45** Футбол. Кубак УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ.
**15.30** Футбол. Кубак УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ.
**16.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. 63 кг.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 69 кг. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 77 кг.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 85 кг. Прамая трансляцыя.
**22.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап. Прамая трансляцыя.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**01.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Дэтэктыўны серыял «Мент».
**18.55** Рэпартэр.
**19.20** «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў».
**19.35** Дак. фільм «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Ноч з генераламі». Канада, 2001 г.
**20.20** Маю права.
**20.35** Кухня.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Сальда.
**21.30** На колах.
**22.00** Інтэрнаўты выбіраюць.
**22.50** Серыял «Кансультацыя ў ружовым садзе».
**23.35** З архіву «Jazz Jamboree»: «Michele Rosewoman New Yoruba». Ч. 1.

## 10 КРАСАВІКА, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Зона Х.
**07.05** Прэс-агляд.
**07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.30** Дзелавое жыццё.
**07.45** Зона Х.
**08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.00** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Рамантычная меладрама «Оля+Коля» (Расія). 1-я серыя.
**11.40** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**11.50** Дзелавое жыццё.
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Шпілька.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Капкан» (Расія). 2-я серыя.
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Маё цудоўнае вяселле».
**18.05** Рамантычная меладрама «Оля+Коля» (Расія). 2-я серыя, заключная.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**23.40** Іранічная камедыя «Страх і трапятанне» (Францыя-Японія).
**01.35** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Алег Табакоў. Здабытак рэспублікі».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.15** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Вялікая розніца».
**22.10** Фільм «Юр'еў дзень».
**01.45** «Наша Belarussia».
**02.15** Нашы навіны.
**02.30-02.40** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Майстар і Маргарыта». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.35** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** КВЗ. Першая ліга. 1/8 Фіналу.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Вострасюжэтны фільм «Пажар на тэлевежы». Германія, 2007г.

---

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Час футболу.
**10.40** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.30** Кінааповесць «Юркавы світанні» (СССР). 4-я серыя, заключная.
**12.40** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі» (Расія). Заключная серыя.
**13.35** Футбол. Кубак УЕФА. Матч 1/4 фіналу.
**15.25** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Літва-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**17.50** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.50** Навіны культуры.
**19.05** Усё аб бяспецы.
**19.35** Бітва экстрасэнсаў.
**20.40** Калыханка.
**21.05** Экспедыцыя.
**21.10** «Грандыёзная гонка». Забаўляльная праграма (ЗША).
**22.05** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**23.45** Трансляцыя Хроснага Шляху з Рымскага Калізея з удзелам Папы Бенедыкта XVI.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Карменіта».
**10.10** Тэлесерыял «Жыццё, якога не было...», 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.30** Фільм «Лёгкая вада». 1972 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Тэатральны летапіс». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**21.25** Фільм «Ніколі не размаўляйце з невядомымі». 2006 г.
**23.00** Навіны - Беларусь.
**23.10** Камедыя «Бабнік-2». 1992 г.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Рускія не здаюцца!».
**10.50** «Авіятары».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Вір».
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Чорны снег-2».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.15** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Угро-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** «Следства вялі...».
**20.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Баявік «Спартанец».
**23.05** Трылер «Паўсвятло».

### EUROSPORT

**09.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 85 кг.
**10.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Групавы этап.
**12.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**13.15** Вось дык так!!!
**13.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**14.45** Футбол. Еўрагалы.
**15.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 85 кг.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Жанчыны. 75 кг. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 85 кг.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 94 кг. Прамая трансляцыя.
**22.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый (Швецыя).
**23.00** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Ірландыі.
**23.30** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Ірландыі.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**00.45** Футбол. Еўрагалы.
**01.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 94 кг.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Серыял «Кансультацыя ў ружовым садзе».
**18.55** Дакументальны фільм «Старыя Кросны». Польшча, 2007 г.
**19.10** Праект «Будучыня».
**19.35** Дакументальны фільм «Аблічча смерці» Германія–Расія, 2005 г.
**20.30** Кінастужка.
**20.45** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Госць «Белсату».
**21.35** Маст. фільм «Краявід пасля бітвы». Польшча, 1970 г.
**23.15** Серыял «На поўных абаротах».
**23.45** «Містэрыя Божае пакуты на Познанскай цытадэлі». Ч. 1. Польшча, 2007 г.
**00.00** Аб'ектыў.

## 11 КРАСАВІКА, СУБОТА

---

**06.25** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.55** Брытва Окама.
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.10, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**09.45** Здароўе.
**10.25** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.40** OFF STAGE LIFE.
**12.10** Гераіка- прыгодніцкі фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (СССР).
**13.45** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**14.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.40** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.45** Відэафільм АТН «Мсціслаўскі шлях» цыклу «Зямля беларуская».
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Прэм'ера. Меладрама «Мы дзіўна сустрэліся» (Расія-Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Святочнае богаслужэнне на Ўваскрэсенне Хрыстова ў Мінскім архікафедральным касцёле Панны Марыі. Прамая трансляцыя.
**00.00** «Уласнай персонай».
**00.25** Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** АНТ прадстаўляе: «Кветкі як цуд». Дакументальны фільм. Заключная серыя.
**11.30** Прэм'ера. Фільм «Птушка-Гогаль». 2-я серыя.
**12.55** Суботні «Ералаш».
**13.20** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.50** «Кінаметры вайны». «Паядынак. Мама, я жывы».
**14.20** «Мама, я жывы!». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** Прэм'ера. Эдвард Радзінскі. «Напалеон. Жыццё і смерць». Фільм 2-і.
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.45** Прэм'ера. «Леднiковы перыяд: Глабальнае пацяпленне».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Леднiковы перыяд: Глабальнае пацяпленне». Працяг.
**22.30** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.10** «Што? Дзе? Калі?».
**00.30-02.10** Фантастычны фільм «Паляўнічы за прышэльцамі».

---

**07.05** «Гарачы лёд».
**07.30** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.20** Фільм «Прыгоды Электроніка «. СССР, 1980г. 1 -ая серыя.
**09.35** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Семнаццаць імгненняў вясны». СССР, 1973г. 3-я і 4-я серыі.
**15.30** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Мужчынскія гісторыі».
**18.10** «Top Gear. Руская версія».
**19.00** «Малая Радзіма».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Дарога на Арлінгтан». ЗША, 1999г.
**22.20** Музычная радыёпрэмія «Залатое вуха».
**00.10** Фільм «Чорная котка, белы кот». Югаславія, 1998г.

---

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.10** Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Таемны густ.
**10.35** Жансавет.
**11.05** Школа рамонту.
**12.05** Невытлумачальна, але факт.
**13.00** «Полацкія лабірынты: бясконцы сон».
**13.30** Запал па культуры. Ток-шоў.
**14.10** Жаночая ліга.
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ліверпуль-Блэкберн. Прамая трансляцыя.
**16.40** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». 1-я серыя.
**18.05** Касмаполітэн. Відэаверсія.
**19.05** Прыгодніцкая камедыя «Адрыў па поўнай» (Расія).
**20.35** Жаночая ліга.
**21.10** Трагікамедыя «Графіці» (Расія).
**23.30** Казанова.
**00.05** Камедыя становішчаў «Госць» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** Шматсерыйны фільм «Міхайла Ламаносаў».»Ад нетраў сваіх». 1984 г.
**08.25** Мультфільм.
**08.45** «Мой срэбны шар».
**09.40** «Суботнік».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** Фільм «Афёра Цэпліса». 1972 г.
**13.00** Дэтэктыў «Вяртанне Турэцкага». Фільм 3 «Трыяда», серыя 1.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Адвакат».1990 г. 1-2 серыі.
**17.00** Прэм'ера. «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгенія Петрасяна».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.35** Вострасюжэтны фільм «Помста». 2007 г.
**23.25** Фільм «Аліса і Букініст». 1992 г.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Асоба небяспечны!».
**14.05** Вострасюжэтны фільм «Адзін дзень».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Жаночы погляд».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.05** Драма «К-19».
**01.25** Крымінальная камедыя «Такое жыццё».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**12.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**13.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Жанчыны. +75 кг. Прамая трансляцыя.
**15.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 105 кг. Прамая трансляцыя.
**18.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Фінал.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Жанчыны. +75 кг.
**21.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 105 кг.
**22.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**01.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў ЗША (Лос-Анджэлес). Паказальныя выступы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода».
**18.40** Дакументальны фільм «Невядомая Беларусь»: «Дарога да пекла. Атрута». Беларусь, 2008 г.
**19.10** На колах.
**19.40** Канцэрт царкоўнай музыкі. Ч. 1
**20.10** Дак. фільм «ПНР дэ люкс». Польшча, 2007 г.
**20.30** Кружэлка.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Еўропа сёння.
**21.40** Маст. фільм «Вакол свету за васемдзесят дзён». ЗША–Югаславія, 1989 г.
**23.15** Дакументальны фільм «Званы Беларусі». 2008 г.
**23.45** «Містэрыя Божае пакуты на Познанскай цытадэлі». Ч. 2. Польшча, 2007 г.
**00.00** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 12 КРАСАВІКА, НЯДЗЕЛА

### 1

**06.45** Прыгодніцкі серыял «У пошуках капітана Гранта» (СССР).
**07.55** Альманах вандраванняў.
**08.20** Пастырскае слова на Вялікдзень Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча.
**08.30** Існасць.
**09.00** Навіны.
**09.05, 15.30** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.05** Культурныя людзі.
**10.40** Усе стыхіі.
**11.10** У свеце матораў.
**11.45** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.00** Навіны.
**12.10** Слова Мітрапаліта Філарэта на Вербную нядзелю.
**12.20** Героіка- прыгодніцкі фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (СССР).
**13.55** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**14.30** Дакументальны серыял «Таямніцы забытых перамог» (Расія).
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Nota Bene.
**16.05** КВЗ. Пачатак сезону Еўралігі.
**17.55** Суперлато.
**18.55** Зорныя танцы.
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Відэафільм АТН «Таемныя знакі. Анталогія жэсту».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.05** Музычная меладрама «Калі я быў спеваком» (Францыя).

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.10** «Дарослыя казкі аб жывёлах». Дакументальны фільм. Заключная серыя.
**13.40** «Зваротны адлік». «Армія Краёва. Невядомая вайна».
**14.10** «Усё пачынаецца з кахання».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Асцярожна-ежа!». Фільм 2-і.
**17.25** «Каго стукне маланка».
**18.25** Прэм'ера АНТ: «Песні маёй краіны».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. Фільм «Фота маёй дзяўчыны».
**23.30** «Камедзі Клаб».
**00.05** Фільм «Каралёў».

### СТВ

**06.55** «Праверана на сабе».
**07.40** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Першы тралейбус». СССР, 1963г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** «Святыні Беларусі».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** Фільм «Фабрыка шчасця». Расія, 2007г.
**14.45** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэтраманія».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Трое і сняжынка». Расія, 2007г.
**22.10** «Спартыўны тыдзень».
**22.30** «Прафесійны бокс».
**23.25** «Агенцтва «Залатая куля». Серыял.

### ЛАД

**08.10** Дабравест.
**08.35** Мір вашай хаце.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.15** Фантастычны серыял «Прыгоды Электроніка» (СССР). 1-я серыя.
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.05** Сезон ля дачы.
**12.45** Пасоўванне+.
**13.05** Гаспадар.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР). 2-я серыя.
**15.00** Трансляцыя Вялікоднага Паслання і Благаславення «Граду і Свету» з Ватыкана.
**15.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Матч 2-а тура. Прамая трансляцыя.
**17.50** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці» (ЗША).
**18.45** «У здаровым целе-здаровы дух». Відэафільм («Белвідэацэнтр»).
**18.55** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Беларусь-Казахстан. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.40** «Правы чалавека».
**21.55** Экспедыцыя.
**22.25** Свая музыка.
**22.55** Пасоўванне +.
**23.20** Музычная камедыя «Адзіночкі» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Шматсерыйны фільм «Міхайла Ламаносаў». «Брама вучонасці». 1986 г.
**08.25** Фільм «Капітан Джэк». 1972 г.
**09.40** Мультфільмы.
**10.05** «Смехапанарама» Яўгенія Петрасяна.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Грымёр. Прафесар маскіроўкі». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Вяртанне Турэцкага». Фільм 3 «Трыяда», серыя 2.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Адвакат». 1990 г. 3-я серыя.
**15.35** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.30** Прэм'ера. Фільм «Малахольная».
**22.35** Прэм'ера «Метро».
**00.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** Выратавальнікі.
**10.55** «Прафесія-рэпарцёр».
**11.25** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.15** Прыгодніцкая фантастыка «Бібліятэкар».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Барацьба за ўласнасць».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.05** «Галоўны герой».
**22.15** «Руская не здаюцца!».
**22.55** Баявік «Сахара».
**01.00** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Фінал.
**11.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Жанчыны. +75 кг.
**12.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 105 кг.
**13.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг. Прамая трансляцыя.
**15.00** Веласпорт. Велагонка Парыж - Рубэ. Прамая трансляцыя.
**18.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Матч за 3-е месца. Прамая трансляцыя.
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 105 кг.
**21.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна Еўропы ў Германіі.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Klash Final.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Прэс-экспрэс.
**18.15** Серыял «Ранча».
**19.05** Канцэрт «Салідарныя з Беларуссю». Ч. 1.
**20.00** Дак. фільм «Без рэтушы»: «Белы ветразь над Прыпяццю». Беларусь, 2008 г.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Курганы».
**21.30** Маст. фільм «Апошні імператар». Брытанія–Кітай–Гон-Конг, 1987 г.
**00.00** Аб'ектыў.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прописам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
№ ______ (по реестру ф. 11)
№ ______ (по реестру ф. 10)

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ______ руб.
______ (сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ______

Адрес ______ (почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
______ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
______ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ЦІКАВА

# УСЁ ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ВЕДАЦЬ ПРА САМІТ «ВЯЛІКАЙ ДВАЦЦАТКІ»

Іван БІЧ

**У Вялікабрытаніі праходзіць саміт лідэраў дваццаці самых развітых краін свету. Напярэдадні лонданскае выданне «Guardian» у іранічнай форме адказала на самыя папулярныя пытанні чытачоў, звязаныя з «вялікай дваццаткай» (G20). Прапануем фрагменты на некаторыя з адказаў.**




### ЧАМУ ЛІДЭРАЎ БУДЗЕ МЕНАВІТА ДВАЦЦАЦЬ?

У тым і справа, што іх не дваццаць. Прэм'ер Гордан Браўн сапраўды запрасіў 20 сваіх калег з 20 краін (Аргенціна, Аўстралія, Бразілія, Канада, Францыя, Індыя, Германія, Інданезія, Італія, Японія, Мексіка, Расія, Саудаўская Аравія, Паўднёвая Афрыка, Паўднёвая Карэя, Турцыя, ЗША, Чэхія — выконвае функцыі старшыні ў ЕС, Іспанія і Нідэрланды). Аднак там яшчэ будзе кіраўніцтва арганізацый Новае партнёрства для развіцця Афрыкі, Асацыяцыі Нацый Паўднёвай Азіі, Камісіі Афрыканскага Саюза, прэзідэнт Еўракамісіі, старшыні Сусветнага банку і Міжнароднага валютнага фонду. Такім чынам, усяго атрымліваецца 29 асобаў.

### ХТО БУДЗЕ ЛІДЭРАМ САМІТУ?

Натуральна, Абама. Ён так і кажа: «Мы гатовыя быць лідэрамі». Аднак амбіцыі ёсць у Нікаля Сарказі, які прадстаўляе Францыю, у Ангелы Меркель (не вельмі захапляецца планам Браўна і Абамы па стымуляцыі эканомікі). Расія таксама любіла раней на нешта прэтэндаваць, аднак зараз кошты на нафту вельмі ўпалі.

### АДНАК ХТО САПРАЎДЫ МАЕ ПРАВА ПРЭТЭНДАВАЦЬ НА РОЛЮ ЛІДЭРА?

Бразілія — бо ў яе самая дынамічная эканоміка ў свеце. Акрамя таго, у краіны вельмі аўтарытэтны прэзідэнт. Кітай — безумоўна, наступная краіна-лідэр XXI стагоддзя. Японія захавае свой уплыў (крызіс у Японіі пачаўся дзесяць гадоў таму, і японцы ўжо ведаюць, у адрозненні ад іншых нацый, як трэба сябе паводзіць у такой сітуацыі). Паўднёвая Карэя і Турцыя — лепшыя эканомікі ў Азіі. Плюс Саудаўская Аравія са сваімі нафтадоларамі.

### ХТО ДАКЛАДНА НЕ БУДЗЕ ЛІДЭРАМ?

Аргенціна, якая не вельмі ўпісалася ў сусветную эканоміку. Аўстралія. Канада. Індыя, дзе гаспадарка расце буйнымі тэмпамі, а ва ўрадзе засядаюць 80-гадовыя дзядзькі. Інданезія — самая вялікая мусульманская краіна на планеце. Італія. Мексіка (занадта шмат раблем з наркотыкамі). Паўднёвая Афрыка мае патэнцыял, аднак дасюль не зразумела, куды яна ідзе. Іспанія сама адмовілася ад вядучай ролі, калі першай вывела войскі з Ірака, а зараз выводзіць з Косава.

### ЯК БУДУЦЬ АХОЎВАЦЬ АБАМУ?

Калі Абама прыбудзе ў Англію, ён перасядзе на верталёт са спецыяльнымі прыборамі на выпадак ракетнай атакі. Непасрэдна ў Лондане Абама будзе ездзіць на машыне Cadillac One. У ім ёсць аўтаматы, газавыя балончыкі, і нават банка з запасам крыві на выпадак ранення. Акрамя таго з Абамай прыедуць 500 чалавек персаналу. Сярод іх ягоны персанальны ахоўнік Рэджы Лав, з якім ён кожную раніцу гуляе ў баскетбол.

### ЧАМУ КОДАВАЕ ІМЯ АБАМЫ RENEGADE (РЭНЕГАТ)?

Кодавыя імёны ахоўнікі пачалі даваць прэзідэнтам у часы, калі баяліся праслухоўвання сваіх размоў. Цяпер такое наўрад ці магчыма, аднак традыцыя засталася. Абама сам прыдумаў сабе кодавае імя. Рэнегатамі называлі ў сярэднявечнай Іспаніі хрысціян, якія пасля прыходу арабаў прынялі іслам. На думку Абамы, у гэтым ёсць нейкая ідэя змены. У яго жонкі Мішэль кодавае імя Renesans (рэнесанс), а ў ягоных дачок Маліі і Сашы — Radiance (свячэнне) і Rosebud (ружовы бутон).

### ШТО ПРЫГАТУЕ ДЖЭЙМС ОЛІВЕР (АСАБІСТЫ ПОВАР ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА) НА ВЯЧЭРУ, ЯКУЮ ДАСЦЬ ГОРДАН БРАЎН ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ САМІТУ?

У мінулым годзе на саміце ў Японіі гасцям прапанавалі вячэру з 18 пераменаў блюдаў. Палітыкі выглядалі ў выніку як мячыкі. Таму на гэты раз вячэра будзе больш сціплай. Джэймс Олівер адмаўляецца адкрываць сакрэт меню. Вядома толькі, што свініны дакладна не будзе. Самае цікавае, што ў вечар прыёму ягоная жонка павінна нарадзіць дзіця. Так што, магчыма, Олівер нават не пабачыць рэакцыю гасцей на ягоныя кулінарныя дасягненні.

### ХТО ВЫРАШАЕ, ДЗЕ БУДУЦЬ СЯДЗЕЦЬ ПАЛІТЫКІ ЗА СТАЛОМ ПАДЧАС ВЯЧЭРЫ?

Трэба спытацца ў міністра замежных спраў. Спецыяльны пратакол патрабуе, каб лідэры краін сядзелі ў цэнтры. Увогуле, вельмі важна таксама, хто будзе сядзець побач. Усе хацелі б, каб іх пасадзілі побач з Абамам. Аднначасова мала хто хоча сядзець з аргенцінскім прэзідэнтам, прыхільніцай фемінізму Крысцінай Фернандэс дэ Кіршнэр або з італьянскім прэм'ерам Сільвіа Берлусконі. Каб не даць падставы для скандалаў, хутчэй за ўсё, усіх пасадзяць за стол па алфавіту.

### ЯК НАКОНТ СУВЕНІРАЎ?

Гордан Браўн прапануе гасцям гальштукі, чайнікі, шакаладкі і саладосці. Што рабіць тым, хто гальштукі не носіць, — напрыклад Ангела Меркель або прэм'ер Індыі Манмахан Сінг? На гэта пытанне супрацоўнік прэс-службы брытанскага МЗС адказаў: «Не ведаю, аднак я вам патэлефаную пазней». Так, праўда, і не патэлефанаваў.

### ЯКАЯ ПАРА БУДЗЕ САМАЙ ПРЫГОЖАЙ НА ВЯЧЭРЫ?

Гэта будзе бітва дзвюх першых лэдзі на брытанскай зямлі: Мішэль Абамы і Карлы Бруні (жонка Сарказі). Праўда, яшчэ ёсць жонка Берлусконі Вераніка Ларыа. Мы не чакаем, што вялікую ўвагу папарацы прыцягне другая палова кітайскага прэзідэнта Ху Цзіньтао. Святлана Мядзведзева — жонка расійскага лідэра, дастаткова сціплая на публіцы. І, натуральна, будзе сенсацыяй, калі кароль Саудаўскай Аравіі прыцягне на вечар хаця б адну са сваіх чатырох жонак. Не будзе партнёраў у Ангелы Меркель і Крысціны Фернандэс.

### КОЛЬКІ КАШТУЕ ГЭТАЯ ТУСОЎКА?

Адпаведна інфармацыі Міністэрства замежных спраў, саміт будзе каштаваць 20 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Кіраўнік МЗС лічыць, што гэта добры ход. Калі пасля саміту міравая эканоміка вырасце хоць на 0,1 працэнта, Аб'яднанае Каралеўства будзе багацей на 1 мільярд фунтаў. Леташні саміт у Японіі каштаваў арганізатарам 285 мільёнаў долараў ЗША.

### АД КАГО З ПАЛІТЫКАЎ МОЖНА ЧАКАЦЬ ВЫХАДАК ПАДЧАС ВЯЧЭРЫ?

Хутчэй за ўсё, нумар можа выкінуць прэм'ер Аўстраліі Кевін Руд. Два гады таму ён прасіў прабачэння ў жонкі за выхадку ў Нью-Йорку. Напіўшыся, палітык пайшоў шукаць прыгод у стрыпбар. Калі алкаголь зноў стукне яму ў галаву на прыёме ў Браўна, ён можа паўтарыць фокус, прыхапіўшы ў кампанію Гордана, Нікаля або Ангелу.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларусь уключаная ў новую і больш маштабную за папярэднюю праграму Еўрасаюзу не без цяжкасцяў і дэбатаў. Адносіны ЕС да беларускага палітычнага рэжыму вядомы ўсім. Беларуская эканамічная мадэль яўна далёкая не толькі ад папулярных на Захадзе ўяўленняў пра рынкавую гаспадарку, але і ад нормаў ЕС, стандартаў WTO. Аднак жаданне раскалоць СНД, аслабіць і так вельмі не дасканалую Саюзную дзяржаву, мінімізаваць геапалітычную вагу Расіі перацягваюць нянавісць да апошняй дыктатуры Еўропы.

**«Евразия» (Расія)**

Цяперашні раскол у лагеры дэмакратычных сіл узрадуе прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку, які ўвесь час гаворыць, што беларуская апазіцыя не ўяўляе салідную палітычную сілу. Прычым беларускаму лідэру будзе асабліва прыемна, што апазіцыянеры перасварыліся паміж сабой напярэдадні важнай падзеі — майскага саміту ў Празе… Між тым, тактычная перамога спадара Лукашэнкі над апазіцыяй не значыць, што ў Еўропе маюць намер весці справу выключна з ім. ЕС да гэтага часу не даслаў прэзідэнту Беларусі запрашэнне прыехаць на саміт.

**«Коммерсант-ъ» (Украіна)**

Разуменне тэрміну «знешняя агрэсія» ў РФ і яе саюзнікаў абсалютна рознае. Такая агрэсія, калі яе разумець як агрэсію на постсавецкай тэрыторыі, не з'яўляецца актуальнай. Яна па сутнасці нават не разглядаецца. Больш рэальнымі з'яўляюцца вайсковыя дзеянні паміж самімі былымі савецкімі рэспублікамі. А АДКБ не мае рэсурсу папярэджання такога кшталту канфліктаў. Больш таго, ніхто не жадае ўдзельнічаць у падобных канфліктах у якасці трэцяй сілы, якая будзе разводзіць праціўнікаў. Адсюль дэмарш Аляксандра Лукашэнкі, які заявіў, што беларускія вайскоўцы не будуць удзельнічаць у аперацыях за межамі краіны.

**«Политком.ру» (Расія)**

Паводзіны звычайных беларусаў і бізнес-колаў у першыя месяцы 2009 года наглядна дэманструюць асаблівасці беларускага менталітэту і арыгінальнасць сацыяльных учынкаў, палітычнай культуры. Параўнальны аналіз сітуацыі ў Беларусі, Украіне, Латвіі, Францыі выяўляе асаблівасць беларускай сітуацыі. Патэрналісцкія настроі шырокіх мас, нізкі ўзровень карпаратыўнай культуры, слабая інстытуалізацыя грамадства, зашмат адміністратыўных правілаў, дэградацыя і дэфрагментацыя інтэлігенцыі, вузкасць кланаў — усё гэта характарызуе беларускі крызіс, якога быццам няма.

**«Фонд стратегической культуры» (Расія)**

Беларусі палітычна выгадна дачакацца, калі Кіргізія або Таджыкістан прызнаюць незалежнасць гэтых рэспублік (Абхазія і Паўднёвая Асеція) і ацаніць рэакцыю сусветнай супольнасці. Маскве ў такой сітуацыі застаецца толькі канстатаваць рэальнасць. Абараняць сваю пазіцыю адной і не сварыцца з Беларуссю — адной з ключавых краінаў, якая транспартуе расійскі газ у Еўропу. Не выключана, што Расія нарэшце перастане мець ілюзіі адносна перспектыў Саюзнай дзяржавы.

**«Новый Регион» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### **ВЕНЕСУЭЛА.** ЧАВЕС ПАЧЫНАЕ ВЫТВОРЧАСЦЬ МАБІЛЬНІКАЎ



Яшчэ не забылася апошняя экзатычная ініцыятыва Уга Чавеса — стварэнне за кошт рэсурсаў нацыяналізаваных латыфундый сеткі танных рэстаранаў «Чавес». А ён ужо выступіў з новым праектам — пачаць у краіне вытворчасць мабільных тэлефонаў. Больш таго, першы айчынны тэлефон павінен з'явіцца на рынку ўжо праз месяц. Называцца ён будзе *El Vergatario* (у перакладзе з мясцовага моладзевага жаргону «супердобры»). Кошт мадэлі — усяго 10 еўра. Тэлефон таксама будзе чытаць папулярныя для запісу і праслухоўвання музыкі фарматы MP3 і MP4. Праўда, цяжка назваць *El Vergatario* выключна венесуэльскім прадуктам. Яго дэталі будуць вырабляць у Кітаі, а ў Венесуэле — выключна збіраць. Так ці інакш, у сваім апошнім выступе прэзідэнт нават зрабіў мабільніку рэкламу. «El Vergatario — лепшы падарунак для мамы», — сказаў Уга Чавес.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### **РУМЫНІЯ.** ДАЧКА ПРЭЗІДЭНТА ІДЗЕ Ў ЕЎРАПАРЛАМЕНТ



Элена Бэсеску, дачка главы Румыніі Траяна Бэсеску, якой споўнілася 28 гадоў і якая спрабуе сябе як мадэль, балатуецца ў дэпутаты Еўрапарламента. Траян Бэсеску, здаецца, не ў захапленні ад ініцыятывы дачкі, інакш Элена не выйшла б з бацькоўскай партыі «Саюз праўды і справядлівасці» і не пайшла б на выбары самастойна. Сыход Элены ў палітыку выклікаў супярэчлівыя каментары. Некаторыя палітолагі лічаць яе ідыёткай, якая думае, што за грошы можна набыць усё, у тым ліку мандат дэпутата. Іншыя кажуць, што дачка прэзідэнта не такая ўжо і неадэкватная: яна закончыла факультэт паліталогіі і нават прайшла практыку ў Еўрапарламенце. У любым выпадку, Элена не унікум. Шмат дзяцей вядомых палітыкаў у гэтым годзе чамусьці падаліся за мандатамі. Сярод іх Бакір Ізетбегавіч, сын Алія Ізетбегавіча (заснавальніка баснійскай дзяржавы) і Міраслаў Туджман — сын першага прэзідэнта незалежнай Харватыі.

**Па матэрыялах «Gazeta Wyborcha» ( Польшча)**

### **КІТАЙ.** КРЫЗІС – ЧАС ДЛЯ СКУПЛЯЦЬ ЗАМЕЖНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ



Дурныя тыя эканамісты, якія кажуць, што Кітай — самы буйны ў свеце уладальнік запасаў амерыканскіх долараў — збірае іх для таго, каб у адзін цудоўны дзень паваліць амерыканскую фінансавую сістэму. Дзякуючы вялікай колькасці баксаў і, як следства, ліквіднасці кітайскіх банкаў, дзяржаўныя кампаніі КНР пачалі апошнім часам маштабныя пакупкі замежных кампаній, якія знаходзяцца на межы банкруцтва. Толькі за люты кітайцы набылі шэраг прадпрыемстваў у Бразіліі, Расіі, Венесуэле, Аўстраліі і Францы. Гэтыя кантракты дазволілі Кітаю ўсталяваць кантроль за шэрагам стратэгічных галінаў гаспадаркі, напрыклад, вытворчасць мінералаў. У 2008 годзе краіна інвеставала 52 мільярды ў набыццё кантрольнага пакет акцый замежных кампаній, а толькі ў лютым 2009-га — 16 мільярдаў. Інвестыцыі таксама дазволілі павялічыць палітычны ўплыў на ўрады некаторых краін, напрыклад Пакістану. Заходнія эксперты б'юць трывогу і заклікаюць свае ўрады адмовіцца ад прынцыпу вольнага рынку, якія дазваляюць кітайцам скупаць важныя галіны эканомікі.

**Па матэрыялах «The Washington Post» (ЗША)**

▸ **КАНГРЭС**

# НОВЫ ЗЯЛЁНЫ КУРС

**Алег НОВІКАЎ**



**27–29 сакавіка ў Брусэлі адбыўся Кангрэс Еўрапейскай партыі зялёных, на якім была прадстаўлена праграма да выбараў у Еўрапарламент.**

Паралельна святкавалі 20-ю гадавіну з'яўлення ў Еўрапарламенце першага дэпутата ад зялёных. З гэтай нагоды арганізатары зрабілі маленькі фільм «Дваццаць гадоў зялёных у Еўрапарламенце», які прадэманстравалі ўдзельнікам канферэнцыі. Фільм — нарэзка ролікаў пра розныя акцыі і справы дэпутатаў з фракцыі зялёных — глядзеўся на адным дыханні. Зялёныя, традыцыйна звязаныя з багемным і артыстычным светам, яўна перанялі ў прадстаўнікоў мастацтва здольнасць арганізоўваць хэпінінгі.

Вось дэпутаты-экологі, нацягнуўшы на твары аднолькавыя маскі, пратэстуюць супраць закону, які дазваляе кланаваць людзей. Вось апрануты піратамі, яны са сцягамі «Вясёлы Роджэр» скачуць па холу ў знак пратэст супраць легалізацыі гена мадыфікаваных раслін. Вось атакуюць Нікаля Сарказі за тое, што ён пагадзіўся ўдзельнічаць у адкрыцці «камуністычнага шоу на касцях тыбетцаў» (так зялёныя называлі Алімпіяду ў Пекіне).

Арыгінальнасць падыходаў зялёных да палітыкі праяўляецца і ў афіцыйных дакументах. Папросту на Кангрэсе была прадстаўлена праграма зялёных да выбараў у Еўрапарламент, якія прызначаныя на пачатак лета.

Праграма, якая называецца «Новы зялёны курс», безумоўна, — своеасаблівы адказ на актуальныя выклікі, перш за на крызіс. Галоўны тэзіс зялёных — цяперашні крызіс не ёсць выключна эканамічным. Абвал выкліканы праваламі ў экалагічнай і сацыяльнай палітыцы. Па сутнасці, на думку зялёных, гэта абвал усёй сістэмы, якую пабудавалі старыя партыі. У сітуацыі, калі назіраецца калапс старых дактрын, час звярнуцца да новых, напрыклад, да мадэлі сацыяльна-экалагічнага грамадства, якую і прапагандуюць зялёныя.

Бачанне бліжэйшай будучыні ў зялёных вельмі радыкальнае.

Паспрабуем уявіць, што ў 2009 годзе ў выніку перамогі зялёных на выбарах у Еўрапарламент будзе прыняты «Новы зялёны курс». Што будзе праз 50 гадоў пасля гэтага?

Да 2050 года еўрапейцы цалкам адмовяцца ад ўжывання вугалю, нафты і атамнай энергетыкі. На той жа час маштабы выкідаў $CO_2$ вернуцца на ўзровень 1990 года — іншымі словамі, скароцяцца на 80 працэнтаў у параўнанні з 2009-м. Інвестыцыі ў зялёную эканоміку дазволяць стварыць мільёны працоўных месцаў. Паўсюдна будзе прадавацца выключна чыстая і здаровая ежа — следства спецыяльна прынятага закону. Нормы супраць брудных прадуктаў выклічуць рост экалагічнага фермерства. Працаваць на падобных прадпрыемствах вельмі добра: жанчыны і мужчыны атрымліваюць роўныя аклады. Няма ніякай дыскрымінацыі з-за таго, што ў цябе іншы колер скуры або этнічнае паходжанне. Людзі працуюць без страху, што іх прадпрыемства можа кожную хвіліну зачыніцца з-за краху нейкага банку. Увесь банкаўскі сектар знаходзіцца пад кантролем ураду ЕС. Чыноўнікі жорстка кантралююць працэс выдачы крэдытаў. З-за палітыкі ЕС банкірам выгадна рабіць галоўныя інвестыцыі ў распрацоўкі новых тэхналогій. ЕС таксама актыўна падтрымлівае такія сферы, як ахова здароўя, адукацыя, дапамога пенсіянерам.

Што да самога ЕС, то канструкцыя яго інстытутаў радыкальна змянілася. Еўрапейскую камісію будзе абіраць сам парламент. Усе рашэнні, якія прымае ЕС, празрыстыя (зараз зялёныя вельмі крытыкуюць цяперашняга кіраўніка Еўракамісіі Мануэля Барозу за тое, што даў згоду на транзіт праз ЕС вязняў тайных турмаў ЦРУ).

Застаецца дадаць, што прыязджаць у зялёную Еўропу іншаземцам будзе вельмі лёгка. Працэдура выдачы віз стане максімальна простай, а калі хтосьці захоча застацца працаваць у ЕС, то аўтаматычна атрымае роўныя правы з тубыльцамі. Тым больш, Еўропа працягвае працэс пашырэння на Усход.

Наколькі рэальна зялёная утопія, галоўнымі фішкамі якой ёсць буйныя інвестыцыі ў новую энергетыку, што, у сваю чаргу, немагчыма без павышэння ролі і дэмакратызацыі Еўрасаюзу?

Праблема зялёных у тым, што адказам на крызіс стаў рост у масавай свядомасці еўрапейцаў сімпатый да пратэкцыянізму і патрабавання вяртання да мадэлі нацыянальнай дзяржавы. Нямецкія левыя нават патрабуюць, каб Германія выйшла з ЕС. Міф аб жыццяздольнасці нацыянальнай дзяржавы гучыць больш-менш рэалістычна, а вось лозунг паскоранай еўрапейскай інтэграцыі пакуль мала каму зразумелы. Слова «Еўрасаюз» часцей выклікае асацыяцыю з бандай бюракратаў, якія ні за што не адказваюць. Зламаць стэрэатыпы будзе цяжка.

Як бы тое ні было, адно прыемна: пра Беларусь зялёныя не забываюць. Еўрадэпутат Рэбека Хармс, адказная за атамную палітыку, раскрытыкавала планы будаўніцтва новых АЭС ва Усходняй Еўропе. Іншы зялёны парламентарый Даніэль Кон-Бендыт заявіў, што для зялёных не можа быць ніякіх кампрамісаў, калі мова ідзе пра правы чалавека ў Беларусі.



КАМЕНТАР

# ЛАСКАВА ПРОСІМ У БІПІДЖАН

**10 сакавіка ў Азербайджане адбыўся ініцыяваны прэзідэнтам Ільхамам Аліевам рэферэндум, знешне канцэптуальна падобны на той, што адбыўся ў Беларусі ўвосень 2004 года. Пра асаблівасці азербайджанскага канстытуцыйнага і палітычнага працэсу журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з азербайджанскім палітолагам Майсісам Гулаліевым.**



***— Няма ніякага сумневу, што апошнія змяненні канстытуцыі былі звязаныя з інтарэсамі адной канкрэтнай асобы. Ільхам Аліеў ужо два разы абіраўся на вышэйшы пост, прычым, мякка кажучы, далёка не дэмакратычна. Якую пазіцыю да апошніх прапаноў заняла апазіцыя? Ці была ў грамадстве вольная палеміка наконт пытання пра змяненне канстытуцыі?***

— Дэмакратычная апазіцыя заняла вельмі супярэчлівую пазіцыю. З аднаго боку, для яе быў зразумелы антыдэмакратычны характар папраўкак. З другога — за апазіцыяй стаіць амбасада ЗША. Так сталася, што рэжым Аліева пасуе геапалітычным схемам Вашынгтона: нафтавы сектар належыць заходнімі кампаніямі, імпарт сыравіны ў Еўропу стабільны. Таму пратэсты апазіцыі насілі абмежаваны характар. Лідэры шмат казалі пра парушэнне дэмакратыі, аднак далей за словы яны не ішлі. Ні ў дзень галасавання, ні напярэдадні ніякіх акцыяй пратэсту не было. Аднак нават ведаючы, што апазіцыя не будзе пратэставаць, улады ўсё роўна зрабілі што маглі, каб альтэрнатыўная думка не рэзала слых. У краіне восем каналаў ТБ. Дык вось, апазіцыя на ўсіх васьмі каналах прыкладна мела на агітацыю — 4 разы па 10 хвілін.

***— Азербайджан — адзіная краіна ў СНД, дзе нягледзячы на крызіс нацыянальная валюта манат каштуе да долару столькі ж, колькі каштавала год таму. Іншымі словамі, дэвальвацыі ў Азербайджане не было. Як гэта можна патлумачыць?***

— Манат сапраўды застаецца стабільным. Такую дзіўную валютную стабільнасць можна разглядаць хутчэй за ўсё як тактычны ход. Калі б напярэдадні рэферэндуму Аліеў пайшоў на дэвальвацыю (усе эканамісты заклікаюць панізіць курс азербайджанскай валюты да ўзроўню 1 долар — 1,25 маната), гэта б выклікала пратэсты ў асяроддзі чыноўнікаў. У выніку, каб падтрымліваць цяперашні курс манату, улады вымушаны былі патраціць чатыры мільярда долараў з тых сямі, якія краіна за 2008 год зарабіла на продажы нафты.

***— Напярэдадні рэферэндуму Турцыя заявіла пра намер адчыніць мяжу з Арменіяй, якую зачыніла ў 1993 годзе ў знак салідарнасці з Азербайджанам. Блакада Арменіі з боку Турцыі разглядалася ў Баку як важны чыннік у вяртанні Азербайджану захопленых Арменіяй тэрыторый Нагорнага Карабаху. Ці адлюстраваўся гэты відавочны дыпламатычны правал Аліева на яговым рэйтынгу?***

— Рашэнне Анкары, натуральна, не спадабалася Баку. Аднак трэба зразумець, што ў міжнародным плане ніякай паслядоўнай палітыкі Азербайджан не праводзіць. Паглядзіце на тое, у якіх абставінах адбываюцца сустрэчы Аліева з армянскім прэзідэнтам. Яны абсалютна шчыра размаўляюць. Затое пасля вяртання дахаты Аліеў моцна крытыкуе армян. Нешта падобнае адбываецца і ў адносінах да іншых краін. Калі да нас прыязджае турэцкі лідэр, Аліеў кажа, што мы і туркі — адна штучна падзеленая нацыя. Калі сустракаецца з іранскім калегам, абавязкова кажа, што мы браты па рэлігіі і г. д. Задача — папросту падтрымліваць імідж. Думаю, калі б ён нават хацеў кінуць палітыку і пайсці ў адпачынак, яго б не пусцілі. На яго вобразе нашчадка Аліева-старэйшага трымаецца ўся легітымнасць улады. Сапраўдныя рашэнні ў краіне прымаюцца на ўзроўні адміністрацыі буйных карпарацый, якія кантралююць азербайджанскую эканоміку. Перш за ўсё мова пра галоўнага інвестара — брытанскую кампанію *British Petroleum (BP)*. Часам Азербайджан нават жартам называюць Біпіджан.

***— Як бы вы маглі ацаніць цяперашні сацыяльна-эканамічны стан Азербайджану?***

— Я адкажу пытаннем на пытанне: колькі вы плаціце на мяжы супрацоўніку беларускай мытні, каб ён дазволіў вам пакінуць краіну? А колькі грошай вучань першага класа ў беларускай школе плаціць настаўніку штомесяц? У нас стала нормай, калі бацькі кожны месяц даюць кіраўніку класу, дзе вучыцца іх дзіця, 20–30 долараў. Пасля гэтага класныя кіраўнікі збіраюцца і пад кантролем дырэктара дзеляць грошы паміж сабой. Вялікая частка хабару, натуральна, ідзе ў кішэню дырэктара. Прыклады з жыцця мытні і школы — гэта і ёсць азербайджанская рэчаіснасць. Дзе і каму «даць на лапу» — няпісаны закон. У грамадстве татальная карупцыя. Любая дзяржаўная пасада лічыцца сродкам зарабіць грошы. Тарыфы ўсім вядомыя. Хочаш стаць дырэктарам сярэдняй школы — калі ласка, пакладзі 30 тысяч долараў. За кошт хабараў сем'і фармуюць 80 працэнтаў свайго рэальнага бюджэту (сярэдні азербайджанец зарабляе прыблізна 500 долараў).

***— Якія Вашы прагнозы на развіццё сітуацыі ў краіне?***

— Мяркую, што цяперашні грамадскі кансенсус будзе парушаны ў 2017–2018 годзе, калі, па разліках спецыялістаў, катастрафічна ўпадзе аб'ем здабычы нафты. На цяперашні час 75 працэнтаў нацыянальнага бюджэту складаецца за кошт продажу сыравіны. Калі паступленні ад продажу нафты будуць скарочаныя гэтак жа катастрафічна, то сацыяльнага калапсу не пазбегнуць. Тады сапраўды ў апазіцыі з'явіцца шанс. Аднак вялікае пытанне — якая апазіцыя скарыстаецца сітуацыяй? Па-першае, цяперашняя дэмакратычная апазіцыя скампраметавала сябе ў першыя гады незалежнасці, калі абяцала за кошт нафты пакрыць дарогі Баку замест асфальту золатам. Па-другое, яна не мае кантактаў з масамі. Усе акцыі апазіцыі забараняюцца. Нарэшце, яна абяцае інтэграцыю ў Еўропу, урад якой дэ-факта падтрымлівае рэжым Аліева. За такімі абставінамі ў вачах простых людзей сапраўдная палітычная і сацыяльная альтэрнатыва становіцца звязаная з ісламам. Па ўсёй краіне будуюцца мячэці, якія робіцца лакальнымі цэнтрамі фармавання грамадскіх настрояў. На працягу апошніх месяцаў у краіне стала ідуць арышты прыхільнікаў Аль-Каіды, аднак рэцэпту барацьбы з гэтым злом органы не маюць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### БЕНЕДЫКТ XVI



Па ўсёй Афрыцы праходзяць акцыі ў абарону Папы з-за кампаніі, якая пачалася ў заходняй ліберальнай і левай прэсе. Дэтанатарам, як вядома, стала заява Папы ў час яго ваяжу па Афрыцы пра тое, што Святы Рым і далей застаецца праціўнікам практыкі выкарыстання прэзерватываў. Такім чынам, як лічаць апаненты Папы, Касцёл даў санкцыю на пашырэнне маштабу эпідэміі СНІДу. Менавіта афрыканскія краіны, дзе каталіцызм дамінуе, з'яўляюцца галоўнымі ахвярамі заразы. Аднак не ўсе згодныя з такім прысудам. Афрыканскія каталікі, якія выйшлі на вуліцы ў абарону Папы, прыводзяць цікавыя факты: у іх краінах прэзерватывы раздаюць даўно, бясплатна, у вялікай колькасці і без згоды Касцёлу, аднак ніякага эфекту гэта практыка не дала. Усяму прычынай мясцовая культурная традыцыя, калі жонка ва ўсім падпарадкоўваецца мужу, у тым ліку і ў інтымных адносінах. Акрамя таго, афрыканцы папросту адмаўляюць СНІД. Так экс-прэзідэнт Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі заявіў, што СНІД — гэта прыдуманы імперыялістамі міф, сэнс якога — маральна саслабіць Афрыку. Затое зніжэнне колькасці хворых на СНІД апошнім часам назіраецца ва Угандзе, дзе ўрад зрабіў стаўку на прапаганду сямейных каштоўнасцяў. Тут колькасць хворых на СНІД, якая 15 гадоў таму складала 15 працэнтаў ад усіх грамадзян, скарацілася да шасці працэнтаў. Менавіта гэту лінію ў вайне з эпідэміяй і адстойвае Рым.

### ХАМІД КАРЗАЙ



Прэзідэнт Афганістану, саюзнік Заходу ў барацьбе з ісламскай фундаменталісцкай групоўкай Талібан, стаў галоўным ворагам для прыхільнікаў жаночай эмансіпацыі. Феміністкі абвінавачваюць яго ў папулізме, заложнікамі якога сталі жанчыны. Каб атрымаць больш галасоў на будучых выбарах, прэзідэнт падпісаў закон, які забараняе жанчынам выходзіць з дому без дазволу мужа. Выключэнне — паход на працу, да доктара або ў навучальныя ўстановы. Таксама закон прадугледжвае пакаранне для тых жанчын, якія адмовілі свайму мужу ў сексе. Фактычна, на думку праваабаронцаў, такім чынам легалізуюцца згвалтаванні. Адна з дэпутатак афганскага парламенту назвала прыняты закон «горшым, чым у часы Талібана». Яна таксама звярнула ўвагу на тое, што законапраект прайшоў усе інстанцыі незвычайна хутка, што кажа пра яго лабіраванне. Між тым, прадстаўнікі заходняга дыпламатычнага корпусу ў Кабуле кажуць, што закон не такі ўжо і рэакцыйны. Па-першае, ён тычыцца галоўным чынам аднаго з плямёнаў, якое заўсёды жыло па традыцыйнаму праву. Па-другое, аўтарам удалося ўпісаць у закон вельмі важныя аспекты. Напрыклад, абмежаваць узрост, па дасягненню якога можна ўступаць у шлюб для дзяўчат (яны павінны мець 16 гадоў). Ужо тое, што сямейныя адносіны выходзяць за межы традыцыйнага права, гэта вялікі прагрэс для Афганістану, кажуць прагматыкі.

### АЛАН ГАРСІЯ



Кіраўнік ураду Перу падклаў бомбу пад стабільнасць міжнародных адносін у рэгіёне. Ён запатрабаваў ад ураду Чылі перадаць пад суверэнітэт Перу 35 тысяч квадратных кіламетраў акваторыі Ціхага акіяну, якія належаць Чылі пасля ціхаакіянскай вайны 1879–1884 гадоў, у выніку якой Чылі захапіла частку тэрыторыі Балівіі. Праблема ў тым, што марскія межы паміж краінамі былі праведзеныя не ў адпаведнасці з міжнароднымі прынцыпамі, а папросту па геаграфічных шыротах. Цяпер Перу патрабуе, каб межы былі перапісаныя адпаведна з міжнароднымі стандартамі. Чылі ўсе патрабаванні Гарсіі, натуральна, адмаўляе, спасылаючыся на нейкія дамовы пачатку 1950-х. Аналітыкі лічаць, што Гарсія намысна гуляе ў нацыяналізм, каб заўчасна выбіць зброю з рук свайго галоўнага палітычнага канкурэнта — Альянта Умала, старшыні нацыяналістычнай партыі. Нечаканай крайняй у гэтым канфлікце аказалася Балівія. Калі Перу ініцыюе працэс перагляду межаў, пытанне вяртання Балівіі згубленага ў XIX стагоддзі выхаду да Ціхага акіяну будзе адкладзена на невядома які час. Між тым, апошнім часам левыя ўрады абедзвюх краін быццам амаль дамовіліся пра арэнду аднаго з чылійскіх партоў пад базу для балівійскага флоту.

▸ КАШТОЎНАСЦІ

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ

Святлана МАРОЗАВА

**На працягу больш як двух стагоддзяў працай шэрагу пакаленняў беларускага народу былі створаныя самабытныя каштоўнасці, звязаныя з дзейнасцю уніяцкай царквы. Яны сталі часткай нашай нацыянальнай культурнай спадчыны, але, на жаль, не знайшлі разумення і прыняцця тых, хто ў XIX стагоддзі ўсталяваў на беларускай зямлі вяршэнства праваслаўя. Духоўная пераарыентацыя на Усход, закліканая ўзмацніць палітычную інтэграцыю Беларусі ў склад Расійскай імперыі, суправаджалася знішчэннем культурнага набытку уніяцтва. Нішчылася любая мясцовая даўніна, якая не была падобная да расійскай. Пры гэтым не толькі вынішчалася уніяцкая традыцыя, але і перапісвалася наша гісторыя.**







## Бібліятэкі і архівы

Пачатак сапраўднай вайны супраць спадчыны уніяцкай царквы быў пакладзены ў 1833–1834 гадах, хаця заканадаўчая база падводзілася раней. Пачалі з ліквідацыі базыльянскіх манастыроў і іх навучальных установаў, якія мелі багатыя бібліятэкі і архівы. У 1828 годзе была зачынена свецкая базыльянская вучэльня ў Жыровіцкім манастыры, у 1835-м — знакамітая сваімі выхаванцамі Барунская базыльянская школа. З кнігазбору і архіву базыльянаў гродзенскага Барыса-Глебскага (Каложскага) манастыра больш за тысячу тамоў кніг у 1870-я гады былі перададзены ў Віленскую публічную бібліятэку, а стосы царкоўных дакументаў утварылі асобны фонд Беларускага дзяржаўнага гістарычнага архіву ў Гродна. Паперы Тадулінскага манастыра захоўваюцца сёння ў Нацыянальным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь у Мінску. А колькі манастырскіх кніжных і дакументальных багаццяў было тады расфармавана, перавезена, згублена, спарахнела ў скляпах і на гарышчах, папсавана пацукамі, спалена. Усяго ў 1835 годзе было скасавана 36 кляштараў з 81-го больш ці менш значнага духоўна-культурнага асяродку нашага краю.

## Храмы і абрады

Культавыя пабудовы, заснаваныя ў XVII–XVIII стагоддзях як уніяцкія, пераводзіць на праваслаўныя пачалі яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя. Гэты працэс ішоў у тры этапы і супадаў з урадавымі наступамі на унію ў 1780, 1794–1796 і 1830-х гадах.

Бывала, вернікам часова ўдавалася адстаяць храмы. Адданасцю сваёй святыні ўвайшлі ў гісторыю сяляне вёскі Свяцілавічы. У 1800 годзе раз’юшаны натоўп узброеных дубінамі людзей выштурхаў за вясковую ваколіцу праваслаўных місіянераў і прадстаўнікоў губернскай улады, што прыбылі для пераасвячэння храма. У 1822 годзе свяцілавіцкія уніяты зноў не дапусцілі місіянераў, хоць на дапамогу ім прыбыла паліцыя. Вяскоўцы заявілі, што з’яўляюцца фундатарамі гэтай царквы, пабудавалі яе ў памяць продкаў і наважаны памерці пры ёй, але ў іншую веру не аддадуць. Імператарскім загадам іх часова пакінулі ў спакоі.

Распараджэннем грэка-уніяцкай калегіі 1830 года ва уніяцкай царкве аднаўляўся ўсходні абрад. 7 лютага 1834 года была прынята пастанова пераабсталяваць храмы на ўсходні лад, забяспечыць іх кнігамі маскоўскага друку, ліквідаваць запазычанні ў заходнехрысціянскім духу. Выконваючы іх, біскуп Іосіф Сямашка ў 1835 годзе загадаў на працягу года ўстанавіць у цэрквах іканастасы, у якіх уніяцкім абразам не было месца. Дзеля гэтага з расійскіх губерняў былі выкліканы мастакі і майстры.

## Пераабсталяванне царкоўнага інтэр’ера

Пераабсталяванне храмаў паводле праваслаўных канонаў сустрэла непрыняцце, а то і абурэнне людзей. Людзі не разумелі, чаму тое, што яшчэ ўчора шанавалася, лічылася святым, сёння прыгнятаецца і забараняецца. І супраціўляліся як маглі. У 1834 годзе рэзка скарацілася наведвальнасць сялянамі Голдаўскай царквы Лідскага павета пасля ўсталявання ў ёй новага іканастаса. Многія пайшлі ў суседнюю Баброўскую царкву, дзе захаваўся ранейшы інтэр’ер.

У 1836 годзе насельнікі маёнтка Рэчыцы Пінскага павета, «*не быв вразумлены приходским своим священником Хлебцевичем о долженствующем быть устроении в церквах униацких иконостасов*», адсунулі да сцяны пастаўлены пасярод алтара сталец і падрыхтаваныя для іканастаса рамы. Як заўсёды ў такіх выпадках, на месца «надзвычайнага здарэння» прыбывалі чыноўнікі і ад імя губернатара даводзілі сялян да розуму.

Да Рэчыцкай царквы было прыпісана больш за 600 вяскоўцаў, 238 з іх пасля адпаведнай апрацоўкі губернатарскімі пасланцамі «выказалі жаданне» далучыцца да праваслаўя. Астатнія засталіся адданымі уніі і яе каштоўнасцям. У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захавалася справа «Аб разбурэнні прыхаджанамі Рэчыцкай царквы іканастаса. 1836 год».

## Супраціў святароў

Святароў абавязвалі даць распіскі аб адказнасці за пераабсталяванне храмаў на грэка-рускі манер, што таксама выклікала працідзеянне. Вайсковы начальнік Вілейскага і Дзісенскага паветаў у 1836 годзе дакладаў полацкаму архібіскупу В. Лужынскаму, што толькі ў адной трэці цэркваў Дзісеншчыны зроблены іканастасы, а стальцоў і ў пятай долі няма з-за ўпартасці святароў, якія з розных прычынаў ухіляюцца ад збудавання іканастасаў, не даюць знішчаць лаўкі і званочкі, і гэтаму спрыяюць благачынныя.

Некаторыя святары далі распіскі, што не ў стане пабудаваць іканастасы з-за беднасці прыхаджан і адсутнасці царкоўных грошай. Тады абавязалі абшарнікаў унесці патрэбную суму, але святары адмовіліся ад такой дапамогі. Сярод «самых шкодных святароў» архівы захавалі імя Антона Самовіча, які не прымаў ад паноў грошы на іканастас, выконваў набажэнства па-ранейшаму ды распаўсюджваў чуткі, што ўладкаванне царквы на ўсходні абрад — гэта выдумка губернатара. Хутка ён быў асуджаны на двухтыднёвую епітым’ю і змешчаны з пасады.

Даволі шматлікім было апазіцыйнае духавенства ў Літоўскай епархіі, на захадзе Беларусі. Слонімскі земскі спраўнік даносіў у 1834 годзе ў Літоўскую духоўную кансісторыю на любішчыцкага святара Гамаліцкага, які, спасылаючыся на старасць і хваробы, адмаўляўся пераабсталёўваць сваю царкву.

З-за супраціву духавенства і насельніцтва ўвядзенне іканастасаў у Гродзенскай губерні зацягнулася, у сувязі з чым яе кіраўніцтва патрабавала ад чыноўнікаў і паліцыі «асаблівай на гэты конт клапатлівасці». Мясцовым уладам давялося ўзмацніць ціск на святароў, прыхаджан і абшарнікаў.

Актыўны ўдзел свецкай адміністрацыі ў гэтых мерапрыемствах выклікаў у грамадстве хвалю падазрэнняў, што праводзіцца чарговая кампанія грамадзянскіх уладаў. Архібіскуп Сямашка вымушаны быў абвяргаць гэтыя чуткі і тлумачыць, што рэформа здзяйсняецца епархіяльнымі ўладамі, якія дзейнічаюць «*ни своим домыслом, ни самовольно*», але выконваюць манаршую волю, выказаную ва ўказе 22 красавіка 1828 года.

У 1837 годзе ваенных начальнікаў паветаў абавязалі сачыць і даваць штомесячныя справаздачы пра пераабсталяванне храмаў. Тым не менш, той жа восенню з Берасцейскага павета даносілі, што ў вёсках Астрамечы, Косіцы, Камяніца Жыровіцкая «*за многим настаиванием успеха не видно*». У шэрагу цэркваў не было мясцовых абразоў, якія б замянілі выкінутыя уніяцкія. Апошнія часцей за ўсё замяняліся на творы расійскіх мастакоў. Вандруючы па Маскве ды Пецярбургу ў 1841 годзе з крыжам Ефрасінні Полацкай, які да гэтага быў святыняй уніятаў, полацкі архібіскуп сабраў там вялікія ахвяраванні на пераабсталяванне храмаў сваёй епархіі.

## Знішчэнне «лацінскіх скажэнняў»

Ачышчэнне уніяцкай царквы ад «лацінскіх скажэнняў» прадугледжвала знішчэнне скульптураў, бо праваслаўе не прызнала аб’ёмных выяваў біблейскіх персанажаў. Але пакланенне былых уніятаў выявам святых анёлаў адзначана нават у другой палове XIX стагоддзя. Да 1865 года ў капліцы Моўчадскай царквы Слонімскага павета была скульптура Антонія Падуанскага вышынёй у рост чалавека, якую працягвалі шанаваць праваслаўныя вернікі. Па загаду ўладаў яе прыбралі, і на гэта месца паставілі абраз прападобнага Антонія. «Літоўскія епархіяльныя ведамасці» за 1894 год паведамілі, што і цяпер народ па-ранейшаму прыходзіць сюды да Антонія Падуанскага і з глыбокай пашанай паглядае ў акно царкоўнага склепа, з якога відаць кавалкі статуі.

Рэшткі уніяцкай атрыбутыкі (скульптуры, абразы, бакавыя стальцы з падсвечнікамі ды «пушкі») у наваствораных праваслаўных храмах выклікалі незадавальненне свецкіх і духоўных уладаў. Аглядаючы ў 1865 годзе Гродзенскую губерню, генерал-губернатар Каўфман аддаў загад адправіць рэчы уніяцкага царкоўнага побыту ў Літоўскую духоўную кансісторыю. Але мітрапаліт Іосіф Сямашка, зрабіўшы кар’еру на «ўз’яднанні», сакрэтна загадаў знішчыць іх пад наглядам благачынных.

У 1870 годзе духоўнае начальства выявіла ў шэрагу цэркваў Дзісенскага павета розныя скульптурныя выявы. Мітрапаліт Макары, наступнік Іосіфа, загадаў пазбавіцца іх спакваля, карыстаючыся, напрыклад, рамонтам або афарбоўкай царквы. Аднак «рэшткі лацінства» заставаліся і пазней. Вынесеныя на загад епархіяльнага начальства з прыходскіх храмаў, многія ўпрыгожванні знайшлі прытулак у прыпісных і могільнікавых цэрквах.

Частка маёмасці уніяцкіх храмаў (абразы, культавыя рэчы, царкоўная вопратка, харугвы, кнігі) была вывезена ў суседнія касцёлы і там захоўвалася. Але пасля паўстання 1863 года пачынаецца наступ і на каталіцтва. Любая знойдзеная там рэч з адзнакамі ўсходняй абраднасці магла стаць падставай для пераводу яго ў царкву. Таму ксяндзы пачалі знішчаць гэтыя «кампраметуючыя» рэчы: у 1860-я гады, напрыклад, іх палілі ў Дзісне і Друі, у 1880-я — у мястэчку Гарманавічы (Дзісенскага павета).

Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя ў царкоўных званіцах, скляпах, у пыле і брудзе, у спарахнелых шафах і скрынях рызніц знаходзілася шмат розных старажытных рэчаў: драўляных скульптур, кніг, абразоў.

**Працяг у наступным нумары**

РОЗДУМ

# ЧАЧНЯ І ЛІТАРАТУРА

Алесь АКУЛІЧ

**Ці спявае мірны народ ваярскія песні? І што гаворыць пра сваіх стваральнікаў адна з самых «ваенізаваных» літаратур свету — руская? Літаратура, якая нараджалася і жыла на крыві і помсце, якая так і не здолела вывесці з сябе вірус агрэсіі: ад старадаўніх летапісаў (той пайшоў на таго, забіў гэтага, спаліў тое), ад класікаў XVIII–XIX стагоддзяў і ажно да сучаснай растыражаванай (або масавай) прозы. Некалькі прыкладаў. І — не толькі творчасці.**




1840 год. Будучы расійскі класік паручнік Тэнгінскага пяхотнага палка Міхаіл Лермантаў удзельнічае ў паходзе на цвярдыню-крэпасць Грозную (сённяшні Грозны). Грымяць шматлікія «экспедыцыі» супраць непакорных чачэнцаў. «*Во время штурмов неприятельских завалов на реке Валерике*, — сведчыў у сваім рапарце пра Лермантава генерал Галафееў, — *он исполнял возложенное на него поручение с отличным мужеством и хладнокровием и с первыми рядами храбрейших ворвался в неприятельские завалы»*. *За гэта быў «представлен»* да вышэйшай узнагароды — ордэна Уладзіміра з бантам. Гісторыя захавала і рапарт камандзіра Асобнага Каўказскага корпуса аб узнагароджванні М. Лермантава за ўдзел у «экспедыцыі» ў Малой Чачні з 27 кастрычніка па 6 лістапада 1840 года. Паэт за чачэнскія баталіі быў уганараваны генерал-лейтэнантам Грабэ залатой шабляй з надпісам «За храбрасць». Узнагароджаны не за асветніцкую дзейнасць, а за бойню, вайну, і вайну — не айчынную, не вызваленчую.

А як сёння чачэнскім школьнікам распавядаць пра класіка? Як, да прыкладу, яны ўспрымуць ягоныя паэтычныя «ваярскія» пасланні? Пра літаратурныя «перагібы на месцах» у савецкай імперыі задумваліся пільныя рэдактары-цэнзары. Разгорнем, як узор, паэму-пасланне Лермантава «Валерык».

Валерык — назва рэчкі, прыток Сунжы, што ўпадае ў Цярэк. Назва паходзіць ад «Валеран хі» / «Смерці рака» і па-чачэнску гучала б як Валарг. Лермантаў удзельнічаў у бітве, апісанай ім у паэме, 11 ліпеня 1840 года. Чытаем у мільёнамі выдадзеных тамах:

*Нам был обещан бой жестокий,*
*Из гор Ичкерии далёкой*
*Уже в Чечню на братний зов*
*Толпы стекались удальцов.*

Хоць у арыгінале (спашлёмся, напрыклад, на выданне «*Сочинений М. Ю. Лермонтова под редакцией П. В. Быкова» 1891 года* (Т.1, с.109) пра аніякі «братний зов» і паміну не было, а пісалася чорным па белым:

*Уже в Чечню на бранный зов*
*Толпы стекались удальцов.*

М. Лермантаў распавядаў пра сапраўдную бойку як відавочца і ўдзельнік, і — прызнацца — у тых радках бачыцца таксама і дакументальная хроніка вайны Расіі і Чачні 1930 года, калі вайнахі паўсталі пад кіраўніцтвам Шыта Істамулава (і супраць іх кінулі некалькі дывізій Чырвонай арміі на чале з камандуючым Паўночна-Каўказскай вайсковай акругі Бяловым, які пасля двухмесячных баёў і падману паўстанцаў Савецкім урадам задушыў супраціў), бачыцца і нядаўні 1997 год:

*Вдруг залп... глядим:*
*лежат рядами.*
*Что нужды? Здешние полки*
*Народ испытанный... «В штыки*
*Дружнее!» — раздалось за нами.*
*Кровь загорелася в груди!*
*Все офицеры впереди…*
*Верхом помчался на завалы,*
*Кто не успел спрыгнуть с коня…*
*«Ура!» — и смолкло. —*
*«Вон кинжалы…*
*В приклады!» — и пошля резня.*
*И два часа в струях потока*
*Бой длился; резались жестоко,*
*Как звери, молча, с грудью грудь.*
*Ручей телами запрудили.*
*Хотел воды я зачерпнуть —*
*И зной, и битва утомили*
*Меня — но мутная волна*
*Была тепла, была красна…*

Зрэшты, падобных «літхронік» не бракуе і ў сучаснай Расіі. І цяпер — як толькі не вычвараецца расійская славеснасць-журналістыка, якімі толькі тэрмінамі не прыхоўвае сваю агрэсіўнасць ды само слова «вайна»! І «аперацыяй» назаве, і «*принуждением к миру*». А непакорны ў стагоддзях вайнахскі народ — і «бандфарміраваннямі», і «тэрарыстамі», і «зялёнымі», і «сепаратыстамі»... Толькі цяперашнія рэдактары-цэнзары ўжо не зважаюць на далікатныя «нюансы» падпальвання міжнацыянальнай і міжэтнічнай варажнечы. А сучасная руская літаратура белетрызуе агулам не свой боль пра «вайну і мір», не гераізуе вызваленне айчыны ад агрэсара-ворага, а сама становіцца духоўным агрэсарам. Хоць падобнае — па-за скрыжалямі літаратурнага кодэксу. Падобнае — невылечная бацыла імперскай ненасытнасці. Падобнае — лакмусавая паперка спаконвечнай (нават пасіянарнай) імперыялістычнасці-агрэсіўнасці расійскай ментальнасці.

А як яшчэ можна ахарактарызаваць цяперашнія тэксты пра «вызваленне спаконрускага Крыма» ці пра ўсё тых жа «злосных чачэнаў»? Нястомныя серыялы ў прозе тыпу «Спецназ. ГРУ» Міхаіла Несцерава нястомна друкуюцца па вялікіх рускамоўных абшарах: «*На данный момент своей цели террористы достигли: задача «посветиться» уже выполнена и кроваво-зелёные флаги уже показаны*».

Ад літаратараў-мужчын не адстаюць і жанчыны. Вось драбок словазлучэнняў з папулярнай Паліны Дашкавай: «чеченская саранча», «*тошнило от одного вида чеченцев, которых в последние годы развелось», «без настоящей войны с чеченами не обойтись*»... І гэта — толькі з невялікай аповесці!..

Факт застаецца фактам: і сёння руская літаратура змагаецца з Чачнёй, і пакуль так будзе — не зважаючы на вайсковыя перамогі — у Ічкерыі будуць нараджацца кіраўнікі-паэты, такія, як Зелімха Яндарбі.

Непаслухмяных кіраўнікоў можна знішчыць. Паэтаў жа — немагчыма. Дык навошта ж народам ваярскія песні? Асабліва — пра сваё знішчэнне?..

РЭЦЭНЗІЯ

# З БЕЛАСТОЦКАЙ ЗЯМЛІ

Мікола КАНАНОВІЧ

**Кніга Сяргея Чыгрына «З Беластоцкай зямлі» змяшчае 52 нарысы пра выбітных беларусаў, якія паходзяць з Беласточчыны. Выданне пабачыла свет у студзені 2009 года ў Беластоку дзякуючы Праграмнай радзе тыднёвіка «Ніва».**




Сяргей Чыгрын яшчэ з савецкіх часоў з'яўляецца аўтарам «Нівы» — газеты беларусаў у Польшчы. Многія нарысы, змешчаныя ў новай кнізе нашага калегі, раней друкаваліся ў тыднёвіку «Ніва». Выглядае лагічным, што Праграмная рада гэтай легендарнай беларускай газеты знайшла сродкі і ажыццявіла выданне саліднага тому свайго сталага аўтара.

«Сяргей Чыгрын, друкуючы на старонках «Нівы» свае нарысы, дорыць нашай гісторыі і культуры невялікі ўрывак штодзённай працы, зробленай на карысць Бацькаўшчыны незвычайнымі асобамі… Аўтар — збіральнік і захавальнік памяці беларускіх прозвішчаў і імён Сямятыцкай, Гайнаўскай, Бельскай, Беластоцкай, Гарадоцкай, Крынкаўскай, Сакольскай, Дуброўскай зямель, — напісаў у прадмове да кнігі «З Беластоцкай зямлі» яе рэдактар Яўген Вапа, а напрыканцы дадаў: — Хочацца верыць, што на працягу найбліжэйшага часу беларускімі навуковымі інстытутамі ў Польшчы і Беларусі будзе распрацавана праграма па падрыхтоўцы бібліяграфічнага слоўніка беларусаў Падляшскай зямлі. Гэта зямля, як дзеці і нашчадкі вартыя такога выдання».

У салідны том пад каляровай цвёрдай вокладкай увайшлі многія адрэдагаваныя аўтарам нарысы, якія раней змяшчаліся ў кнізе «Беларуская Беласточчына», што выйшла ў свет летась у Беларусі. Дыхтоўнае выданне «З Беластоцкай зямлі» займае 308 старонак і праілюстравана 125 здымкамі. Калі чытаеш кнігу, дзіву даешся, якой усё ж беларуская Беласточчына была багатай на таленавітых людзей. Шмат новых звестак і фактаў чытачы знойдуць пра Дамініка Аніську, Адама Бычкоўскага, Язэпа Варонку, Янку Геніюша, Сяргея Дубінскага, Уладзіслава Казлоўскага, Любоў Разумоўскую, Уладзіміра Тамашчыка, і многіх іншых — тых, хто ўнёс важкі ўклад у гісторыю Беларусі.

Некаторыя героі новай кнігі Сяргея Чыгрына цяпер жывуць у межах сучаснай Беларусі і ўжо паспелі падзякаваць аўтару за прыемны падарунак, які знаёмыя ці сваякі даслалі ім з суседняй Польшчы.

Чытачы ў Беларусі хутка змогуць набыць «З Беластоцкай зямлі» Сяргея Чыгрына ў мінскіх кнігарнях.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# ПАСЛЯ СВЯТА 25 САКАВІКА

**Людзей на святкаванні Дня Волі каля Акадэміі навук было столькі, колькі было. Людзей, для якіх гэты дзень з'яўляецца сапраўдным святам — беларускай дзяржаўнасці, беларускага адраджэння, беларускай мовы, беларускай гісторыі, беларускай надзеі на добрую будучыню. Выбітным днём у шэрагу звычайных.**

Большая частка з прысутных — маладыя людзі да 30–35 гадоў. Але былі, як заўжды, і людзі сталага веку. З прыязнымі ўсмешкамі, адкрытымі поглядамі. Як мала іх засталося… А памятаеце, колькі іх было 5–10 гадоў таму? Шмат хто адышоў у лепшы свет, шмат хто ўжо нямоглы, каб прыйсці на свята. Але тыя, хто яшчэ мае сілы, — былі тут.

І менавіта ім усім мне хацелася б сказаць словы шчырага захаплення і ўдзячнасці за тое, што яны захавалі гэта свята, захавалі памяць пра тых, хто змагаўся за свабодную, вольную, дэмакратычную Беларусь. Ім, якія без прымусу, па поклічу душы, штогод адкрыта святкавалі гэты дзень. У любое надвор'е, пад пагрозай рэпрэсій. Святкавалі і адстаялі. Перадалі эстафету маладзейшым. І ўжо відавочна, што са зменай пакаленняў гэта свята не знікне са свядомасці новых пакаленняў.

Вольга Полазава, Мінск

▸ КОНКУРС

# У ІМЯ ЕЖЫ ГЕДРОЙЦА

Аляксей ХАДЫКА

**31 сакавіка ў Польскім Інстытуце ў Мінску ўзнагародзілі пераможцаў IX конкурсу імя Ежы Гедройца на лепшую журналісцкую працу ў беларускіх сродках масавай інфармацыі за 2008 год на тэму польска-беларускіх адносін у галіне культуры, навукі і мастацтва.**



Уладзімір Давыдоўскі

Конкурс заснаваны ў 2000 годзе ў гонар славутага ўраджэнца Мінска (у яго гонар названая адна з вуліц сталіцы) Ежы Гедройца (1906–2000), выдаўца і галоўнага рэдактара польскага парыжскага часопіса «*Kultura*» (з 1947-га), ладная частка выпускаў якога прысвячалася не толькі польскай, але беларускай праблематыцы. Дэкляраванае Гедройцам яшчэ ў 1950-я гады бачанне будучыні Украіны, Літвы і Беларусі як незалежных еўрапейскіх дзяржаў надоўга зрабіла яго персонай нон-грата ў СССР. Зараз яго імя служыць сімвалам культурнага яднання суседніх народаў.

З 34 кандыдатаў, якія прадставілі працы ў розных галінах журналістыкі, ад тэле-, радыё- і інтэрнэтпраграм да папяровых СМІ, журы вылучыла пяць лаўрэатаў (першую і трэцюю прэміі не ўручалі). Другой прэміяй быў уганараваны паэт, літаратуразнавец, гісторык Сяргей Чыгрын са Слоніма за выдадзеную «Беларускім кнігазборам» кнігу гісторыка-краязнаўчых і літаратурных нарысаў «Беларуская Беласточчына». Дыпломы з адзнакай атрымалі тры ўдзельнікі. Алег Лукашэвіч быў узнагароджаны за паказаны на БТ умежах аўтарскага праекта «Эпоха» фільм, прысвечаны Адаму Міцкевічу. За папулярызацыю польска-беларускіх культурных стасункаў у сваіх артыкулах ушанавана Ларыса Цімошык.

А пачціва названы «грамадзянінам ВКЛ» журналіст Уладзімір Давыдоўскі быў адзначаны за культурна-гістарычныя праграмы на радыё «Рацыя» і «Свабода», артыкулы ў часопісе «Абажур», а таксама работу над парталам «Вялікае княства» (*http://3force.info*).

Уладзімір Давыдоўскі — музыка, мастак і літаратар, адзін з заснавальнікаў легендарнага гурта «Мроя», аўтар інфармацыйнага праекта «Сусветная служба «Беларускай Маладзёжнай» (1991–1994). З апошняга ў 1992 і вырасла ідэя-праект «Вялікае Княства», у межах якой паўстала і музыка аднайменага гурта, і літаратурныя творы. У 2006 годзе яна ўвасобленая ў электронны партал, на якім асвятляюцца падзеі ў розных галінах культуры і мастацтва, актуальнага грамадскага жыцця і гісторыі. Галоўны прынцып, дэкляраваны яго стваральнікамі: «умацаванне грамадзянскай супольнасці ў краіне на грунце духоўных, культурных, гістарычных і дэмакратычных каштоўнасцяў». Важная пазіцыя — камунікацыя зацікаўленых беларусістыкай наведвальнікаў з розных краін, нездарма Уладзімір з задавальненнем адзначае, што апрача карэспандэнтаў з Беларусі, Польшчы, Расіі, сотні карыстальнікаў завітваюць на партал і з ЗША, і, што не зусім тыпова — з Францыі.

Уладзімір Давыдоўскі з нагоды перамогі ў конкурсе адказаў на пытанні «НЧ».

***— У чым для цябе значнасць конкурсу імя Ежы Гедройца?***

— Конкурс стаў для мяне ў літаральным сэнсе падсумаваннем усяго таго, што было зроблена за апошнія гады. Адначасова — адказам на пытанне, наколькі сэнсоўнай была праца. Я атрымаў адказ. Ён для мяне — лёсавызначальны.

***— Што заахвоціла да ўдзелу?***

— Гэта адбылося летась. Падчас падарожжа па Беласточчыне ў якасці журналіста «Радыё Свабода», у адным з мястэчак я патрапіў на незвычайны спектакль. Ролі ў ім выконвалі чачэнскія дзеці. Адзін з акцёраў быў без дзвюх ног, бо патрапіў на міны. Спектакль, як і вакацыі дзяцей (якія бачылі толькі ваенныя жыцці), арганізаваў фонд Ежы Гедройца. І ў канкрэтнай сітуацыі супрацоўнікі фонду імкнуліся праз творчасць і культурныя каштоўнасці вярнуць дзяцей да нармальнага ўспрымання мірнага жыцця. Прычым рабілі ўсё шчыра, самаахвярна, не маючы на мэце ўласную карысць. Гэтыя памкненні мне вельмі зразумелыя і блізкія. Таму, калі я ўбачыў абвестку пра конкурс, то найперш прыгадаў той спектакль і падумаў, што сустрэну аднадумцаў, якія, як і я, лічаць, што культура — зблізае людзей і народы.

Перамога ў конкурсе дае ўпэўненасць у абраным шляху. А таксама прыцягвае новых сяброў і аднадумцаў, з якімі можна здзейсніць цікавыя і патрэбныя людзям праекты.

***— Ці важнае для цябе імя Гедройца ў тытуле конкурсу?***

— Надзвычай важнае і сімвалічнае, разам з тым справа яшчэ і ў людзях, якія сваімі пачэснымі ўчынкамі ўшаноўваюць яго імя. Яны мне сімпатычныя сваімі чалавечымі якасцямі.

▸ ВЫСТАВА

# ВІНШАВАННЕ З ВЯСНОЙ АД ПУШКІНА

Аляксей ХАДЫКА

**29 сакавіка ў фальварку-галерэі «Добрыя мыслі» (вул. Магілёўская,12) адчынілася выстава «Алесь Пушкін у Добрых мыслях».**



Адкрыццё экспазіцыі аднаго з самых цікавых мастакоў сучаснай Беларусі Алеся Пушкіна, падрыхтаванай Таццянай Гаранскай і Віктарам Маркаўцом, адбывалася з удзелам самога мастака, які з'явіўся перад публікай у вясёлым берэце-палітры, расквечаным свежымі фарбамі. Не толькі яскравыя колеры віталі надыход вясны: у экспазіцыі акрамя ўжо класічных работ канца 1980–2000-х Алесь прадставіў свой канцэптуальны праект «Беларуская шпакоўня».

Апошні ўжо выклікаў фурор на кірмашы «Дызайн-Фармат–2008» летам мінулага года ў павільёне «Белэкспа», калі шпакоўні «Для Драздоў» (залатая з гербам для элітнага пасёлку чыноўнікаў у Мінску) і «Для аграгарадкоў» (з чырвона-зялёнымі кайданкамі і дротам) былі неадэкватна ўспрыняты дырэкцыяй выставы. Тое, што актуальнае мастацтва мае жывы сацыяльны змест, — у аўтарытарнай сістэме ўспрымаецца як палітычная правакацыя.

Варта зазначыць, што Алесь сапраўды закрануў важных птушак за самае святое, іранічна зірнуўшы на птушынае жытло. Але ж праект па сутнасці гуманістычны і вясёлы, тут ёсць птушыныя дамкі і для тых, «хто за адмену смяротнае кары альбо супраць мірнага атаму». І проста ў падарунак для дзяўчат на 8 сакавіка. І «для свядомых», пад саламяным брылём.

Як заўважае хітравата пасмейваючыся мастак, праз шпакоўню кожны гаспадар прыватнага ўчастка можа выявіць сваё стаўленне да жыцця. Шпакоўня «Мілітарная» — для былых генералаў, «Стальная» — для сталіністаў, «Еўрапейская» са сцягамі «славянскіх рэспублік»



Маці



— для прыхільнікаў еўраінтэграцыі, уключна Расію. Забаўная гульня сэнсаў і вобразаў ужо прыцягнула да практычнага ўдзелу ў праекце палітыкаў, музыкаў, пісьменнікаў. Назавём толькі Аляксандра Мілінкевіча, Змісера Вайцюшкевіча, Святлану Алексіевіч.

Выстава дае магчымасць адчуць не толькі гульнявыя складовыя часткі таленту Пушкіна. Жывапісныя творы другой часткі экспазіцыі дазваляюць адчуць яго выключна моцную энергетыку манументаліста, увасобленую ў станкавых творах. Шчымліва шчырыя — «Партрэт маці» (1989) або нацюрморт «Бывай, Радзіма» (1996). Даты і тэмы — вельмі важны кампанент пры расшыфроўцы закладзенай у работы мастака думкі. Дарэчы, хіба не лепшае эсэ, прысвечанае жыццёваму шляху 44-гадовага творцы і дасягнутаму на ім, напісана крытыкам Пятром Васілеўскім. Прэзентацыя кнігі апошняга «Рэтраспектыва», дзе эсэ надрукавана, адбудзецца на выставе ў прысутнасці Пушкіна ў бліжэйшую суботу, 4 красавіка, а 14-й гадзіне. Арганізатары выставы запрашаюць — уваход вольны.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 03.04.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.